❑ **У Клецкім раёне выяўлена сховішча атрутных рэчываў.** 1-я стар.

❑ **Скандалы: у Гродне — з акцыямі, у Магілёве — з курынымі кумпячкамі.** 1-я—3-я стар.

❑ **Душа маці крычыць. Што робяць рукі для выпраўлення становішча?** 2-я стар.

❑ **«Нябесная канцылярыя» папярэджвае: уцяпляйцеся!** 1-я стар.

ЗВЯЗДА

8 лютага 1996 г. чацвер, № 37 (22840)

● выдаецца са жніўня 1917 г. ● БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА ● цана 1000 рублёў

МАРОЗ МАЦНЕЕ

Учора з раніцы ў рэдакцыю патэлефанавала Алена Забаронак з Мінска, якая спытала, ці сапраўды ў бліжэйшыя суткі тэмпература паветра панізіцца да 40 градусаў. «Такія чуткі ходзяць сёння па горадзе», — сказала яна.

Мы звязаліся з Белгідраметам, дзе нам паведамілі, што ў бліжэйшыя суткі чакаецца далейшае пахаладанне, але не да такой ступені. Месцамі па рэспубліцы маразы будуць дасягаць у начны час 30—32°С. Пахаладанне, па прагнозах сіноптыкаў, працягнецца прынамсі да 10 лютага.

Сяргей ПРОТАС.

РОЗГАЛАС

ЧАРНОБЫЛЬСКІ ЗАКАЗ ГАДЗІННІКАВАМУ ЗАВОДУ

Мінскі гадзіннікавы завод атрымаў заказ на выраб партыі гадзіннікаў, якія будуць уручаны ўдзельнікам ліквідацыі аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

Заказчык — агенцтва «Чарнобыльінформ» з Украіны, гэтай дабрачыннай акцыяй мяркуе такім чынам хоць неяк аддзячыць тым людзям, якія 10 гадоў назад па волі лёсу сталі ліквідатарамі. Многія з іх ужо страцілі здароўе, знаходзяцца на пенсіі. І гэты сціплы падарунак нагадае ім, што яны не забыты.

Гадзіннікі будзе ўпрыгожваць сімволіка: крыж з кропляй крыві на фоне шасцівугольнай схемы атамнага ядра. І надпіс: «Удзельніку ліквідацыі аварыі на Чарнобыльскай АЭС».

Наш гадзіннікавы завод выбраны па некалькіх прычынах: тут і якасць прадукцыі, і вядомасць маркі, але галоўным стала тое, што выкананне заказу будзе больш танным, чым на маскоўскіх заводах.

Леанід ТУГАРЫН.

«ДУКАТ» РАСПЛАЦІЦЦА З УКЛАДЧЫКАМІ

Як стала вядома карэспандэнту газеты, прынята рашэнне аб тым, каб разрэзерваваць частку рэзерваў банка «Дукат» у Нацыянальным банку Беларусі. Гэта мера прынята для таго, каб камерцыйная ўстанова магла разлічыцца з укладчыкамі, фізічнымі асобамі, па рублёвых укладах.

Між тым, як вядома, адным з акцыянераў «Дуката» з'яўляецца і былы банк «Беларусь». У банкаўскіх колах, дарэчы, гэты факт выклікае здзіўленне: чаму б фінансавай установе з дастатковымі рэзервамі і сродкамі не кінуцца на дапамогу «Дукату»? Аднак, відаць, выратаванне тапельца — справа рук самога тапельца.

Ігар ГРЫШЫН.

ДЗЯРЖАЎНАЯ МАЁМАСЦЬ ВЫКАРЫСТОЎВАЕЦЦА НЕЭФЕКТЫЎНА

Паводле звестак Міндзяржмаёмасці, за апошнія два гады на больш як 1,5 тыс. прадпрыемстваў і арганізацый Міністэрства транспарту і камунікацый, Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі, канцэрна «Беллеспаперапром» і іншых ведамстваў былі праведзены праверкі па пытаннях эфектыўнага выкарыстання дзяржаўнай маёмасці.

Як аказалася, практычна на кожным трэцім з правераных аб'ектаў выяўляліся разнастайныя парушэнні ў пытаннях адчужэння і здачы ў арэнду дзяржмаёмасці, якія нанеслі дзяржаве значны матэрыяльны ўрон.

Толькі сума ўрону, нанесенага дзяржаве незахаваннем парадку адчужэння асноўных фондаў (ад заніжэння цаны рэалізацыі і па іншых прычынах) склала 13,8 млрд. рублёў. І ўсяго толькі 3 мільярды з гэтай сумы ў працэсе праверкі ўдалося спагнаць.

Сяргей КУРКАЧ.

УКАЗЫ АБ УСТАНАЎЛЕННІ ДЫПЛАМАТЫЧНЫХ АДНОСІНАЎ

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка падпісаў указы аб устанаўленні дыпламатычных адносінаў паміж Рэспублікай Беларусь і Ліванскай Рэспублікай, Рэспублікай Сенегал, Туніскай Рэспублікай і Іарданскім Хашыміцкім Каралеўствам.

Міністэрству замежных спраў Рэспублікі Беларусь даручана прыняць неабходныя меры для афармлення дыпламатычных адносінаў з гэтымі краінамі.

БЕЛТА.

РЭЖАМ, ЯК І АБЯЦАЛІ

1468 танкаў і 867 баявых браніраваных машын ліквідавана ўжо на Барысаўскім рамонтным заводзе.

Да 26 красавіка гэтага года плануецца скараціць яшчэ 405 танкаў і 242 баявыя машыны.

Аляксандр МАКАРАЎ.

САМАЛЁТУ ПАШАНЦАВАЛА, АЛЕ СТРАХУ НАЦЯРПЕЛІСЯ...

Па інфармацыі, атрыманай у прэс-групе Упраўлення ўнутраных спраў на транспарце, 4 лютага ў АУС на паветраным транспарце паступіла паведамленне ад дзяжурнага авіяцыйна-выратавальнай службы аэрапорта «Мінск-2», што ў самалёце Ту-154 азербайджанскай авіякампаніі, якая выконвае рэйс Мінск—Баку, у час узлёту не ўбраліся шасі.

На борце знаходзілася 67 пасажыраў. У 16.30, пасля выпрацоўкі паліва ў паветры да пасадачнай вагі, самалёт удала зрабіў пасадку ў аэрапорце «Мінск-2». Ахвяр і пацярпеўшых няма. Прычыны няспраўнасці ўстанаўліваюцца.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ЗАХОЎВАЮЧЫ СТАБІЛЬНАСЦЬ

З мэтай прадухілення ажыятажных спекуляцыйных аперацый на міжбанкаўскім рынку, недапушчэння росту кошту крэдытаў, прадастаўляемых эканоміцы, і кіруючыся артыкулам 20 Закона «Аб Нацыянальным банку Рэспублікі Беларусь» галоўнае грашова-крэдытнае ведамства краіны вызначыла верхнюю мяжу працэнтнай стаўкі па міжбанкаўскіх крэдытах у памеры не больш трохкратнай стаўкі рэфінансавання. Яе памер сёння складае 5,5 працэнта ў месяц.

Дзмітрый ЖУК,
прэс-служба Нацбанка.

НАРУЧНІКІ І РЭВАЛЬВЕРЫ І Ў ОРШЫ НЕ ГОРШЫЯ

Участак па вытворчасці газавых рэвальвераў і наручнікаў абсталяваны ў арэндным таварыстве «Орша». Так цяпер называецца завод лёгкага машынабудавання, што спецыялізуецца на вырабе прамысловых швейных машын. Ён распачаў выпуск уласнай мадэлі рэвальвера, распрацаванай заводскімі канструктарамі.

Раней прадпрыемства займалася толькі зборкай камплектуючых для зброі, пастаўляемых з Расіі. Заказчыкам грознай прадукцыі з'яўляецца міністэрства ўнутраных спраў рэспублікі.

Паліна АЛЯКСАНДРАВА.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПРЫНЯЎ ВЫКАНАЎЧАГА ДЫРЭКТАРА МВФ

На макраўзроўні Беларусь ужо дасягнула пэўных поспехаў у эканоміцы. Аб гэтым заявіў 7 лютага Прэзідэнт рэспублікі Аляксандр Лукашэнка ў час сустрэчы з выканаўчым дырэктарам Міжнароднага валютнага фонду Вілі Кікенсам. Кіраўнік дзяржавы таксама адзначыў, што цяпер неабходна вырашаць праблемы і на мікраўзроўні. Вось чаму актуальна вызначыць эфектыўныя шляхі далейшага супрацоўніцтва Беларусі з МВФ.

Праведзены дыялог быў заснаваны на ўзаемным імкненні дасягнуць фінансавай стабілізацыі ў краіне, рэфарміраваць эканоміку і стварыць неабходныя ўмовы для яе эфектыўнага развіцця.

БЕЛТА.

Фота БЕЛТА.

З ПЕРАМОГАЙ!

ГЕРМАНІЯ
Горад Рупальдынг
08663884200

Нацыянальная каманда Рэспублікі Беларусь па біятлону
ІВАШКУ, РЫЖАНКОВУ, САШУРЫНУ, ПАПОВУ

Дарагія Пётр, Алег, Вадзім і Аляксандр!

Ваша бліскучая перамога на вельмі адказным чэмпіянаце свету па біятлону са шчырым захапленнем і вялікай радасцю сустрэта ў Беларусі. Наш народ высока ацэньвае ваш цудоўны поспех, які праслаўляе маладую беларускую дзяржаву на сусветнай арэне.

Хуткай лыжні, удачы ў стральбе вам у астатніх стартах!

Спадзяюся, што і нашы таленавітыя біятланісткі возьмуць з вас прыклад і паспяхова прадоўжаць пачатую вамі «залатую» спартыўную эстафету ў алімпійскім 1996 годзе. Падтрымайце іх. Мы па праву і сардэчна ганарымся вамі. Хвараэм за вас.

Чакаем на роднай зямлі дарагіх і любімых землякоў-пераможцаў.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

7 лютага 1996 года.

УКАЗ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

№ 46

АБ ЧАСОВЫМ ЭКСПАРТНЫМ МЫТНЫМ ТАРЫФЕ

У мэтах упарадкавання вывазу тавараў з мытнай тэрыторыі Рэспублікі Беларусь і да прыняцця адпаведнага рашэння Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь **пастанаўляю:**

1. Прадоўжыць да 1 студзеня 1997 г. тэрмін дзеяння часовага экспартнага мытнага тарыфу Рэспублікі Беларусь, уведзенага Пастановай Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 28 красавіка 1994 г. «Аб часовым экспартным мытным тарыфе Рэспублікі Беларусь» (Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 1994 г., № 17, арт. 287).

2. Гэты Указ уступае ў сілу з 1 студзеня 1996 г.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. ЛУКАШЭНКА.

5 лютага 1996 г., г. Мінск.

У ПРЭЗІДЫУМЕ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Пад старшынствам Сямёна Шарэцкага 6 лютага адбылося пасяджэнне Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Абмеркаваны ўдакладнены праект парадку дня першай сесіі Вярхоўнага Савета трынаццатага склікання.

Дэпутатам ад імя Прэзідыума будзе прапанавана ўключыць у яе даклады Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі і прэм'ер-міністра Міхаіла Чыгіра. Прынята пастанова Прэзідыума «Аб накіраванні афіцыйнай дэлегацыі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь на сёмае пасяджэнне Савета Міжпарламенцкай асамблеі дзяржаў—удзельніц СНД» на чале са Старшынёй Вярхоўнага Савета Сямёнам Шарэцкім.

Прынята рашэнне запрасіць дэлегацыю Дзяржаўнай думы Расійскай Федэрацыі на чале з яе Старшынёй Генадзем Селязнёвым наведаць Беларусь з афіцыйным візітам у канцы лютага—пачатку сакавіка.

Зацверджаны пастановы аб узнагароджанні Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета, разгледжаны іншыя пытанні.

Прэс-служба Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь — БЕЛТА.

SOS!

ДЫХЛОРЭТАНАМ НАС ЯШЧЭ НЕ ТРУЦІЛІ

Аднак больш за 36 тон гэтага рэчыва ляжыць на беразе рэчкі Лань у Клецкім раёне

Чарнобыль стаў не толькі сімвалам катастрофы веку, найвялікшым злачынствам перад чалавецтвам, але і жорсткім экалагічным урокам. На жаль, гэты ўрок на Беларусі засвоілі дрэнна. Пагроза новых, вялікіх і малых чарнобыляў у нашай краіне застаецца ўсё яшчэ даволі верагоднай. Бо не знікла галоўная прычына экалагічнага самазабойства — злачынная халатнасць.

31 студзеня супрацоўнікамі ўпраўлення па барацьбе з эканамічнай злачыннасцю (УБЭЗ) Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі сумесна з работнікамі Клецкага РАУС на тэрыторыі Клецкага раёна было выяўлена сховішча атрутных рэчываў. Зрэшты, сховішчам яго назваць можна толькі ўмоўна. Склад знаходзіўся пад адкрытым небам, на беразе рэчкі Лань. Напачатку «ўбэзаўцы» думалі, што ў ёмістых бляшаных бочках знаходзяцца звычайныя ядахімікаты. Зараз, як вядома, ядахімікаты — вельмі дэфіцытны тавар, які ахвотна за долары купляюць польскія і літоўскія камерсанты, таму зладзеі і палююць за ім па калгасных і саўгасных складах.

Аднак калі супрацоўнікі УБЭЗ атрымалі вынікі экспертызы, то былі шакіраваны. Больш як год (атрута знаходзілася на беразе ракі фактычна без аніякай аховы) над Беларуссю вісела пагроза другога Чарнобыля. Як выявілася, у бочках знаходзіўся дыхлорэтан.

Аб тым, што гэта за рэчыва і наколькі яно небяспечнае, сведчыць заключэнне спецыялістаў Беларускага навукова-даследчага санітарна-гігіенічнага інстытута. Вось што, прынамсі, канстатуецца ў даведцы, падпісанай дырэктарам гэтага НДІ В. Стэльмахам.

— Паведамляем, што дыхлорэтан адносіцца да вельмі небяспечных рэчываў (па ДАСТу 12.1.007-76 «Шкодныя рэчывы. Класіфікацыя і агульныя патрабаванні бяспекі» — 2 клас небяспечнасці).

Дыхлорэтан (хлорысты этылен, этыленхларыд) уключаны ў «Пералік аварыйна небяспечных хімічных злучэнняў (моцнадзеючых атрутных рэчываў)».

Дыхлорэтан — палітропная атрута. Паражае галаўны мозг, парушае функцыі сардэчна-сасудзістай і дыхальнай сістэм, страўнікава-кішачнага тракта, печані і нырак. Праходзіць нават праз непашкоджаную скуру.

Атручэнне дыхлорэтанам адносіцца да цяжкага віду інтаксікацый: у 80 працэнтах выпадкаў наступае лятальны зыход. Найбольш цяжкія атручэнні адбываюцца ў выпадку, калі дыхлорэтан трапіць унутр арганізма.

Мінімальная смяротная доза для чалавека — 10—30 мл.

Звярніце ўвагу: на складзе захоўвалася больш за 36 тон гэтай атруты. Няцяжка падлічыць, што ахвярамі халатных гаспадароў дыхлорэтану маглі стаць сотні тысяч чалавек.

Дарэчы, па іроніі лёсу ўладальнікам атруты з'яўляецца клецкае малое прадпрыемства «Рызыка».

Рызыка ўзнікнення экалагічнай катастрофы сапраўды была вельмі вялікай. Склад, як ужо адзначалася, фактычна не ахоўваўся. Значыць, любы блазан ці проста надзвычай цікаўны чалавек мог адкрыць бочкі і выліць дыхлорэтан. Не выключана таксама была і самаразгерметызацыя ёмістасцей, бо знаходзіліся яны пад дажджом і снегам, і, натуральна, іржа праз нейкі час зрабіла б «сваю справу». А паколькі паблізу працякае рака, то атрута магла заліць немалую частку краіны. Ды і ў паветры дыхлорэтан не менш шкодны. Як сведчаць спецыялісты, хранічнае атручэнне можа узнікнуць нават у вытворчых умовах. Напрыклад, пры забруджванні паветранага асяроддзя ў два-тры разы ў людзей узнікае млявасць, зніжаецца кіслотнасць страўнікавага соку; пры насычанасці паветра дыхлорэтанам у 50—150 мг на куб. м з'яўляецца млосць, задышка, галаўны боль, бяссонніца і нават павелічэнне і боль печані, пры больш высокіх дозах наступае смерць.

Між іншым, перыяд паўраспаду дыхлорэтану ў атмасферы — 6 тыдняў, а ў вадзе — больш за 1000 тыдняў.

Так што і ў гэтым плане аналогіі з чарнобыльскай аварыяй маглі б быць даволі блізкія.

Дзякуючы пільнасці супрацоўнікаў УБЭЗ Міністэрства ўнутраных спраў краіны бяду ўдалося прадухіліць.

Як гэта ні парадаксальна, але ў нашай дзяржаве, што больш за іншых пацярпела ад катастрофы стагоддзя, можна без праблем набыць дзесяткі тон небяспечнай атруты і такім чынам стварыць пагрозу жыццю і здароўю соцень тысяч мірных жыхароў. Памятаеце, мінулагодні скандал з продажам расійскімі вайскоўцамі на Беларусі высокатаксічнага рэчыва «самін» у якасці паліва для кацельняў. Тады неяк абышлося. І вось сітуацыя зноў паўтараецца. Па звестках «Звязды», клецкія камерсанты набылі дыхлорэтан у 1992 годзе ў адной з вайсковых часцей, што дыслацыруецца ў Баранавічах. Бізнесмены, па іх жа тлумачэннях, былі ўпэўнены, што купілі звычайны ацэтон. Затым перапрадалі гэты «ацэтон» Сіняўскай мэблевай фабрыцы. Але там хутка разабраліся, што гэта за рэчыва, і вярнулі тавар камерсантам з МП «Рызыка». Тыя нічога лепшага не прыдумалі, як згрузіць небяспечнае рэчыва на беразе рэчкі і заняцца пошукам чарговых пакупнікоў. І больш як год, пакуль бізнесмены шукалі, каму збыць атруту, існавала рэальная пагроза ўзнікнення вялікай экалагічнай катастрофы.

Незразумела, няўжо адпаведным службам так складана ўзяць пад кантроль гандаль атрутнымі рэчывамі, што засталіся нам у спадчыну ад Савецкай Арміі?

Ці будуць на гэты раз зроблены належныя высновы і наведзены строгі парадак у іх захоўванні і рэалізацыі?

Зараз гэта ў прамым сэнсе пытанне жыцця і смерці, бо, па нашых звестках, у вайсковых часцях яшчэ ёсць вялікія запасы высокатаксічных атрутных рэчываў. І хто можа гарантаваць, што гэтую атруту які-небудзь прадпрымальны прапаршчык не збудзе ўсюдыісным камерсантам?

Трэцім разам нам можа і не пашчасціць.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

ПРАЦЯГ СКАНДАЛУ

Акцыянеры «Гроднаабутку» вырашылі забраць у былой «эліты» незаконна набытыя акцыі. Ці атрымаецца?

Летась, як ужо паведамляла «Звязда», акцыянеры аднаго з першапраходцаў раздзяржаўлення і прыватызацыі запрасілі на роднае прадпрыемства пракуратуру. І вось 6 лютага былі абнародаваны вынікі праверкі.

У горадзе над Нёманам яшчэ памятаюць пра леташні бунт тутэйшых абутнікаў. Даведзеныя да адчаю беспрацоўем і безграшоўем, яны выйшлі на вуліцу, перакрыўшы рух транспарту. Грымнуў гром — пачалося «хрышчэнне». Стварылі пагаджальную камісію, дзяржаўныя службы ўзяліся правяраць фінансава-гаспадарчую дзейнасць АТ, нарэшце абнародавалі спіс акцыянераў. Неўзабаве, у красавіку акцыянеры правялі сход і вырашылі прасіць дапамогі ў пракуратуры. На трыбуну падняўся буйнейшы акцыянер «дыхаючага на ладан» АТ — яго дырэктар і па сумяшчальніцтву парламентарый папярэдняга Вярхоўнага Савета Мікалай Юркевіч. Паразважаўшы аб агульным крызісе нашай эканомікі, ён папрасіўся ў адстаўку. На што адна жанчына запатрабавала ад яго спачатку аднавіць тое, што было, і толькі потым «рабіць ногі». У выніку дырэктара з пасады не адпусцілі, аднак у хуткім часе ён усё ж дабіўся свайго. Кажуць, што цяпер М. Юркевіч ужо ў сталіцы, у канцэрне «Беллегпром». Відаць, патэнцыял гэтага спецыяліста лепш раскрыецца менавіта на рэспубліканскім узроўні.

Ну, а новаму кіраўніцтву АТ яшчэ доўга прыйдзецца расхлёбваць тое, што пакінуў яму папярэднік. А перш за ўсё каласальны груз даўгоў на «шыі» прадпрыемства: на сённяшні дзень «картатэка» складае каля 21 мільярда рублёў. Заробак у абутнікаў мізэрны, выплачваецца нерэгулярна, ды і то часта абуткам, які яшчэ трэба прадаць. Агульны крызіс эканомікі? Далёка не толькі гэта. Як паведаміў калектыву на сходзе цяперашні дырэктар АТ Валерый Арлоўскі, «усё было спланавана так, каб паставіць фабрыку на калені». Шэраг фірмаў, ад кантактаў з якімі прадпрыемства мае мільярдныя страты, дырэктар назваў «спрутам». В. Арлоўскі будзе дабівацца ўзбуджэння следства па кожнай, мякка кажучы, сумнiўнай адгрузцы прадукцыі, а таксама правядзення незалежнай аўдытарскай праверкі. «Нам цяпер няма чаго ўтойваць. Як будзем лічыць — такі будзе і наш дабрабыт». Шкада, вядома, што гэтыя словы не прагучалі з вуснаў Валерыя Васільевіча раней, калі ён з'яўляўся галоўным інжынерам. Не ведаў таго, што ведае сёння? Цяпер новы дырэктар ездзіць па судах і праваахоўных органах, каб разабрацца з пакінутай яму спадчынай і выратаваць калектыў ад фінансавага краху. Што атрымаецца і як усё гэта адгукнецца для былога кіраўніка АТ — пакажа час.

Ну а пакуль пракуратура Кастрычніцкага раёна г. Гродна паставіла пытанне аб вяртанні акцый, незаконна набытых М. Юркевічам і шэрагам іншых уплывовых асоб з апарату кіравання. Было так. У верасні 1993 года, парушаючы заканадаўства, стварылі не адкрытае, а закрытае АТ. Здзелкі па каштоўных паперах ажыццяўляліся без дзяржаўнай рэгістрацыі і ўнутраных

(Заканчэнне на 3-й стар.)

ВОСТРЫ АЛОВАК

Малюнак Леаніда РАЗЛАДАВА.

КУРСЫ АБМЕНУ НАЯЎНЫХ ВАЛЮТ

у камерцыйных банках на 7 лютага 1996 г.

Назва банка	Долар ЗША		Нямецкая марка		Расійскі рубель		Тэлефоны
	Купля	Продаж	Купля	Продаж	Купля	Продаж	
Белбізнесбанк (гал. аперац. упраў.)	11750	12000	7850	8150	2.30	2.55	067
Белбізнесбанк (гарадская дырэкцыя)	інфармацыя на 9.50 не атрымана						
Белзнешэканомбанк	11700	11950	7950	8300	2.30	2.48	267-022
ФК «Вераніка»* (за расійскія рублі)**	11850 4760	11980 4860	7900	8200	2.45	2.52	531-504
Ф-л 0104 АКБ «Минский транзитный банк»	11700	12000	7700	8050	2.10	2.45	372-825
Народны банк	11800	12000	7900	8200	2.35	2.52	238-610
«Алімп»	11850	12200	7950	8200	2.45	2.56	508-556
Ф-л № 1 АКБ «Алімп»	11800	12000	7800	8100	2.35	2.48	291-646, 067
«ФФФ»	11600	12000	7800	8100	2.30	2.58	621-601
Нацыянальны банк РБ (курс для безнаяўных разлікаў)	11500		7837.52		2.43		
Цэнтрабанк Расіі	4738		3229.50		100 бел.р. 38.98		

***** — Аперацыя з валютай больш за 1000$ праводзіцца на дагаворных умовах**

Агенцтва «Граўцова»

АНОНС

21 лютага з 14 гадзін «Звязда» праводзіць «прамую лінію» з віцэ-прэм'ерам Кабінета Міністраў Уладзімірам Гіляравічам ГАРКУНОМ, які, як вядома, курыруе пытанні сельскай гаспадаркі.

Званіце па тэлефонах 32-38-21, 68-29-21.

Папярэдне пытанні У. Гаркуну можна задаць па тэл. 68-27-50.

У КАБІНЕЦЕ МІНІСТРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Кабінет Міністраў пастанавіў пункт 2.4. Правілаў прымянення Палажэння аб Дзяржаўным сцягу Рэспублікі Беларусь, зацверджаных раней прынятай ім пастановай ад 7 жніўня 1995 г. №426, выкласці ў наступнай рэдакцыі: «2.4. на марскіх суднах, суднах рачнога флоту, зарэгістраваных у Рэспубліцы Беларусь, — на флагштоку або гафелі».

* * *

Кабінет Міністраў у сувязі з павелічэннем з 1 студзеня 1996 года тарыфнай стаўкі першага разраду прыняў пастанову аб унясенні змяненняў у Палажэнне аб умовах аплаты працы кіраўнікоў дзяржаўных прадпрыемстваў, з якімі заключаны кантракты. Гэта Палажэнне зацверджана пастановай Кабінета Міністраў ад 10 кастрычніка 1995 г. №558.

Згодна з новапрынятай пастановай, ва ўказанае Палажэнне ўнесены наступныя змяненні: у пункце 3 шкала службовых акладаў кіраўнікоў дзяржаўных прадпрыемстваў, з якімі заключаны кантракты, выкладзена ў наступнай рэдакцыі:

«Спісачная колькасць работнікаў прадпрыемства (чалавек)	Кратнасць тарыфнай стаўкі першага разраду
да 200	да 9
ад 201 да 1000	да 10
ад 1001 да 5000	да 11
ад 5001 да 10000	да 13
ад 10001 да 15000	да 15
ад 15001 да 20000	да 17
звыш 20000	да 18";

у пункце 4 словы «выкарыстаных» заменена словам «накіраваных».

Прызнаны страціўшым сілу пункт 4 пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 22 ліпеня 1993 г. №497 «Аб чарговых мерах па сацыяльнай абароне насельніцтва».

* * *

Кабінет Міністраў сваім распараджэннем даручыў Мінпаліўэнерга распрацаваць і зацвердзіць па ўзгадненні з Мінюстам, Мінэканомікі, Мінфінам, Нацыянальным банкам правілы карыстання электрычнай і цеплавой энергіяй.

* * *

Кабінет Міністраў сваёй пастановай зацвердзіў прыкладаемы Дысцыплінарны статут службовых асоб мытных органаў Рэспублікі Беларусь.

Прызнаны страціўшымі сілу:

Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 21 кастрычніка 1992 г. №639 «Аб зацвярджэнні Статута мытнай службы Рэспублікі Беларусь»;

пункт 1.2. Пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 13 ліпеня 1993 г. №458 «Аб змяненнях і прызнанні страціўшымі сілу некаторых рашэнняў Урада Рэспублікі Беларусь па мытных пытаннях».

Прэс-служба Кабінета Міністраў — БЕЛТА.

КАРЭСПАНДЭНТ ВЫЕХАЎ НА МЕСЦА

НЕДЗІЦЯЧЫЯ ТВАРЫ ДЗЯЦЕЙ

Яны прыйшлі ў прыёмны пакой Міёрскай раённай бальніцы, узяўшыся за рукі, — чатырохгадовы Томаш і васьмігадовая Марына. Светленькія галовы, стрыманыя рухі ў зусім нязвыклай і чужой абстаноўцы і... абсалютна ўжо недзіцячыя твары, вочы. Адчуваецца ў іх напружанасць чакання нечага нядобрага і цяжкага, бачыцца след перажытых нягод і жахаў. Я не маю права ад імя чытачоў распытваць дзяцей, ды, напэўна, і не змог бы гэтага зрабіць.

А пачалася гэтая камандзіроўка пасля таго, як «Звязда» ў нумары за 24 студзеня надрукавала ліст Галіны Гурчонак з крыкам ад душы — дапамажыце, не маю ні работы, ні надзейнага жытла, не магу пракарміць двух дзетак. Пісьмо знайшло, трэба сказаць, у рэспубліцы немалы водгук. На Міёршчыне ўжо атрымалі некалькі пасылак, грашовыя пераводы, паступаюць сігналы спачування ў рэдакцыю газеты.

Ды на месцы, у Міёрах, справа падалася не такой адназначнай. Ёсць тут нямала нюансаў, якія вымушаюць працягнуць размову, пазнаёміць чытачоў з іншымі фактамі.

16 студзеня гэтага года Галіна Казіміраўна Гурчонак прывяла сваіх Томаша і Марыну ў памяшканне Міёрскага райвыканкома, дала ім у рукі пісьмо і сказала, у які кабінет заходзіць. Сама ж пакінула будынак. У пісьме было амаль тое, што Гурчонак расказала чытачам «Звязды». [illegible] Першая рэакцыя работнікаў райвыканкома — поўная разгубленасць. Што рабіць? [illegible] Альбо клапаціцца толькі аб дзецях.

Але цяпер ёсць неабходнасць вярнуцца крыху ў мінулае. Галіна Гурчонак (тады яна была яшчэ Бівол, і дзеці ў Галіны носяць розныя прозвішчы) пераехала на Міёршчыну з Полаччыны ў ліпені 1994 года. 22 ліпеня па папярэдняй дамоўленасці са старшынёй мясцовага калгаса імя Кутузава быў пасланы транспарт на Полаччыну і адтуль перавезлі пажыткі. Пасялілася Гурчонак з дзецьмі і сяброўкай альбо сястрой — дакладна гэта не ўстанавілі і праваахоўныя органы (не будзем называць і прозвішча, імя сяброўкі, бо сёння яна знаходзіцца ў Міёрах пад следствам за крадзеж), дык вось, пасяліліся на хутары Розаны ў калгасе імя Кутузава. Сама Гурчонак памылкова называе яго хутарам Барашкі — гэта суседні. Пасяліліся ў хаце, гаспадыня якой выехала ў Дзісну. Часовы прытулак, але зноў жа са старшынёй была дамоўленасць аб тым, што пасля выпрабавальнага тэрміну ў шэсць месяцаў будзе вырашана і праблема з лепшым жыллём. Сталі Галіна і яе сяброўка даглядаць на ферме цялушак. 115 галоў — гэта для дзвюх жанчын не так і проста, але для нашай сельскай гаспадаркі звычайна. Да таго ж Гурчонак гаварыла аб сваіх трактарысцкіх навыках.

Калгас імя Кутузава — гаспадарка, можна сказаць, звычайная. Але тут, хоць і не могуць на сённяшні дзень выплаціць людзям заработную плату за снежань, бо не разлічваюцца і з самой гаспадаркай, — усё ж аб людзях, як могуць, клапоцяцца. Пас- [illegible] валі жыць на хутары. Як заўважылі вяскоўцы, агародам і градамі цікавіліся мала. А вось вандравалі часта. І ў Полацкі раён, і па наваколлі. Бывала, выдавалі сябе за пагарэльцаў, прасілі дапамогі грашыма. Бывала і іншае.

Дзеці былі пры маці і ў вандроўках. Потым Марына пайшла ў недалёкую, за 3 кіламетры, Дрыгуцкую школу. Настаўніца адзначае яе добрую развітасць — умела чытаць. Пры школе працуе сталовая, не зачынілі яе і ў гэты няпросты час. Нешта вырошчваюць на сваіх школьных градах, нешта даплачваюць бацькі. Пяцёра дзяцей былі пастаўлены на бясплатнае харчаванне. Сярод іх і Марына. Настаўнікі падкармлівалі яе ад сябе. Але неўзабаве дзяўчынка перастала наведваць школу па прычыне сёння не такой ужо і недарэчнай — недаядання.

Трэба сказаць, што пачынаючы са снежня мінулага года былі звароты ад Гурчонак і яе сястры-сяброўкі ў інстанцыі Міёрскага раёна за просьбай аб дапамозе. Як удалося мне высветліць, такая дапамога ў памеры 250 тысяч рублёў была выдзелена. Мізэрныя сродкі для гэтага «на раёне», як, напэўна, і па ўсёй рэспубліцы. Давалі толькі многадзетным сем'ям. Але тут зрабілі выключэнне. Ды грошы «на рукі» маці пабаяліся выдаваць. Думаю, прычыны для гэтага ў работнікаў службаў былі. Вырашылі пералічыць іх на школу для харчавання Марыны.

Вось тут і ўзнік канфлікт. Па версіі работнікаў райвыканкома і [illegible]го службаў, Гурчонак патрабавала грошы «на рукі», маўляў, яны і мне трэба. [illegible] Галіне Казіміраўне, што сваім хаджэннем па інстанцыях ні свайго лёсу, ні лёсу сваіх дзяцей яна не паправіць, усё будзе па-ранейшаму, пакуль сам чалавек не пастараецца перарабіць сябе. Я пацікавіўся на Полаччыне, у саўгасе «Шпакоўшчына», адкуль прыехала Гурчонак-Бівол на новае месца. І там пры расставанні не было шкадавання ды міру.

Можна зразумець і кіраўніцтва калгаса імя Кутузава. Шасцімесячны выпрабавальны тэрмін яны ўстанаўлівалі не дзеля формы. Вельмі сёння шмат тых, каго называюць перакаці-полем. І калі б не абараняліся ў калгасах, не прымаючы на работу і ў свае члены тых, каго яны не лічаць дастойнымі, — якія ж гэта былі б калектыўныя гаспадаркі? Але ў той жа час дзеці, якія немаведама на што жывуць і як жывуць на хутары, мелі права на праяўленне ўвагі і з боку калгаса, і з боку сельсавета.

У адпаведнасці з законам дзейнічалі і раённыя ўлады. Не аказвалася дапамога дзеткам таму, што ні прапіскі, ні нават грамадзянства ў Гурчонак не аказалася. І адабралі Томаша з Марынай у прынцыпе правільна. Без гэтага нельга аформіць дакументаў на ўладкаванне дзяцей у дом-інтэрнат. А папера ў нас і сёння самая галоўная сіла.

Ды вось толькі застаюцца два недзіцячыя тварыкі. І самае страшнае, што дзетак разлучаць. Марыне ж трэба вучыцца ў інтэрнаце, а Томашу дарога ў дзіцячы дом.

Алесь КАСЦЕНЬ.

Віцебская вобласць.

РОЗГАЛАС

ПЕНСІЯНЕР, НЕ РАССЛАБЛЯЙСЯ...

Прычынай шматлікіх інцыдэнтаў, якія пачасціліся ў апошні час на транспарце паміж работнікамі кантролю і пенсіянерамі, сталі спрэчкі аб ільготах для некаторых катэгорый грамадзян.

З мэтай прадухілення магчымых канфліктных сітуацый карэспандэнт газеты «Звязда» звярнуўся па растлумачэнне да начальніка аддзела кантролю вытворчага упраўлення транспарту і сувязі Мінгарвыканкома Міхаіла Малахава. Ён, у прыватнасці, паведаміў, што работнікі транспарту ў дадзенай сітуацыі маюць намер кіравацца ў першую чаргу Распараджэннем Прэзідэнта РБ А. Лукашэнкі № 259-РП ад 29.12.95 г. [illegible]

А пакуль наверсе кіпяць страсці, пенсіянер, «не забывайся» набываць талончык.

Надзея НІКАЛАЕВА.

НУ, ЗАЯЦ, ПАЧАКАЙ!

Як стала вядома нашаму карэспандэнту, у Міністэрстве транспарту і камунікацый распрацаваны праект палажэння аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у тыя артыкулы Адміністрацыйнага кодэкса, якія тычацца памераў штрафу за безбілетны праезд у аўтатранспарце.

Прасцей кажучы, міністэрства выступае з ініцыятывай увесці больш жорсткія санкцыі супраць тых грамадзян, якія прызвычаіліся катацца бясплатна. Цікава, што цяперашні Адміністрацыйны кодэкс нават у чымсьці заахвочвае «зайцоў», бо, напрыклад, пры памеры штрафу ў 10 тысяч рублёў (0,1 працэнта мінімальнай зарплаты) праязны на чатыры віды транспарту ў сталіцы каштуе ўсе 120 тысяч. Аналагічная сітуацыя са штрафамі за безбілетны праезд у прыгарадным аўтатранспарце (на сёння — 10 тысяч). Зусім вартымі смеху застаюцца штрафы ў міжгародніх аўтобусах — 0,2 працэнта мінімальнай зарплаты, альбо 20 тысяч рублёў.

Чакаецца, што распрацаваны ў Мінтранспарту дакумент будзе прадстаўлены на разгляд сесіі Вярхоўнага Савета ў самы бліжэйшы час.

Сяргей ГРЫБ.

ПАЛЕМІКА ЮРЫСТАЎ

КАМУ ПЕРАШКАДЖАЕ КАНСТЫТУЦЫЙНЫ СУД?

Адказ на некаторыя «сентэнцыі» ў інтэрв'ю Ю. Г. Малумава

30-31 студзеня 1996 года ў газеце «Звязда» было апублікавана інтэрв'ю з нядаўна выбраным намеснікам Старшыні Вярхоўнага Савета Ю. Г. Малумавым. У ёй ён выклаў сваю пазіцыю па шэрагу пытанняў эканамічнага і палітычнага жыцця рэспублікі і, у прыватнасці, у адносінах да Канстытуцыйнага суда.

Пазіцыя Ю. Г. Малумава па апошнім пытанні і яе матывацыя выклікаюць у мяне поўную нязгоду. Таму хацеў бы ўступіць з ім у палеміку і прывесці свае пярэчанні, а вас, паважаныя чытачы, прашу быць сведкамі і суддзямі нашай спрэчкі.

Так што, пачнём палеміку...

1. Сцвярджэнне Ю. Г. Малумава: «Што датычыць Канстытуцыйнага суда, я першапачаткова лічыў, яшчэ калі яго ўнеслі ў Канстытуцыю, што гэты інстытут абсалютна непатрэбны ў сістэме падзелу ўладаў. Гэта мая асабістая думка як юрыста».

Ці так гэта? Давайце спачатку разбяромся ў азах тэорыі дзяржавы і права.

Падзел дзяржаўнай улады на тры яе складальныя: заканадаўчую, выканаўчую і судовую з'яўляецца агульнапрызнаным прынцыпам дэмакратычнай дзяржавы. Яго назначэнне — не дапусціць сканцэнтравання ўлады ў руках адной асобы.

Заканадаўчая ўлада (парламент) прымае законы і ажыццяўляе кантроль за іх выкананнем. Выканаўчая ўлада (прэзідэнт, урад) рэалізуе прынятыя парламентам законы і не павінна выходзіць за іх межы. Судовая ж улада заклікана вырашаць прававыя спрэчкі і канфлікты, якія ўзнікаюць у грамадстве, і абараняць правы і свабоды грамадзян.

Але калі дзеянні чыноўнікаў можна абскардзіць у суд, то як абараніць грамадзян ад «дрэнных» законаў? Хто павінен забяспечыць за імі кантроль і адпаведнасць іх Канстытуцыі?

Вопыт дзяржаўнага будаўніцтва паказаў, што для дасягнення гэтых мэтаў нічога лепшага, чым інстытут судовага канстытуцыйнага кантролю, не прыдумана. Такі інстытут прадугледжаны канстытуцыямі або фактычна прымяняецца больш чым у 80 дзяржавах. Кантроль за адпаведнасцю заканадаўства Канстытуцыі ажыццяўляюць як вышэйшыя суды, так і спецыялізаваныя органы — канстытуцыйныя суды. Прычым пасля другой сусветнай вайны канстытуцыйны кантроль стаў пераважна ўскладацца на спецыяльныя судовыя органы. Па гэтым шляху ідуць практычна ўсе краіны Еўропы.

Беларусь не засталася ў баку ад прамой дарогі цывілізацыі. Для забеспячэння канстытуцыйнасці прымаемых нарматыўных актаў наша Канстытуцыя прадугледзела заснаванне Канстытуцыйнага суда, які заняў адведзенае яму месца ў сістэме органаў дзяржавы. Ён заклікан быць як бы трацейскім судом у спрэчках па канстытуцыйнасці законаў і іншых нарматыўных актаў. Вырашаючы пытанні аб адпаведнасці Канстытуцыі актаў, прымаемых Вярхоўным Саветам, Прэзідэнтам, урадам і іншымі дзяржаўнымі органамі, ён забяспечвае іх дзейнасць у рамках адведзенага ім Канстытуцыяй «прававога поля». Тым самым Канстытуцыйны суд уносіць свой уклад ў захаванне прынцыпу падзелу ўладаў, хоць сам ніякай улады не мае.

Заўважу, што ў еўрапейскіх дзяржавах канстытуцыйным судам надаецца вялікае значэнне. Яны не толькі правяраюць на прадмет канстытуцыйнасці заканадаўчыя акты, але і даюць тлумачэнне Канстытуцыі, разглядаюць скаргі грамадзян на парушэнне іх канстытуцыйных правоў, вырашаюць спрэчкі аб кампетэнцыі паміж дзяржаўнымі органамі, разглядаюць справы па абвінавачванню Прэзідэнта і інш.

Шэраг замежных вучоных-юрыстаў не без падставы заяўляюць, што сучаснай прававой дзяржавай можа прызнавацца толькі тая, у якой існуюць органы судовага канстытуцыйнага кантролю.

З улікам выкладзенага мяркуйце самі: ці патрэбны нам інстытут канстытуцыйнага нагляду і ці не мае ён адносіны да падзелу ўладаў?

Не толькі прынцыпы прававой дзяржавы, але і вопыт многіх дзяржаў свету даюць адназначны адказ на гэта пытанне.

2. «Формула яго (Канстытуцыйнага суда. — ***М. П.***) **фарміравання таксама вымушае жадаць лепшага: не прамым волевыяўленнем народа, а выбранне парламентам...»**

Застаецца толькі здзіўляцца, што Ю. Г. Малумаву невядомы такі факт: ні ў адной краіне свету Канстытуцыйныя суды не фарміруюцца шляхам выбрання насельніцтвам. Гэта і зразумела: вельмі высокія патрабаванні прад'яўляюцца да прэтэндэнтаў, і галоўнае з іх — прафесіяналізм, аб якім людзям з боку цяжка меркаваць. Таму канстытуцыйныя суддзі праходзяць старанны адбор і выбіраюцца або парламентам (Германія), або парламентам па прапанове кіраўніка выканаўчай улады (Расія, Францыя), або ў фарміраванні саставу суда прымаюць удзел усе тры галіны ўлады (Італія, Партугалія, Балгарыя, Літва).

3. «А правы ў іх (у Канстытуцыйнага суда. — ***М. П.***) **вельмі вялікія».**

Юрый Георгіевіч, ці вам не ведаць, што правамоцнасць у Канстытуцыйнага суда Рэспублікі Беларусь вельмі сціплая ў параўнанні з іншымі судамі. Наш Канстытуцыйны суд па сутнасці толькі правярае канстытуцыйнасць нарматыўных актаў.

Вышэй адзначалася, якімі правамі валодаюць канстытуцыйныя суды ў дзяржавах Еўропы. Для нагляднасці спашлюся на кампетэнцыю нядаўна ўтворанага Канстытуцыйнага суда Рэспублікі Малдова. Дык вось, ён ажыццяўляе кантроль за канстытуцыйнасцю законаў, рэгламентаў і пастаноў парламента, указаў Прэзідэнта, пастаноў і распараджэнняў урада, а таксама міжнародных дагавораў, адным з бакоў якіх з'яўляецца Рэспубліка Малдова; дае тлумачэнне Канстытуцыі; выказваецца па прапановах аб пераглядзе Канстытуцыі; пацвярджае вынікі рэспубліканскіх рэферэндумаў; пацвярджае вынікі выбараў парламента і прэзідэнта; канстатуе абставіны, якія апраўдваюць роспуск парламента, часовае адхіленне ад пасады прэзідэнта або часовае выкананне абавязкаў прэзідэнта; вырашае выключныя выпадкі неканстытуцыйнасці прававых актаў, прадстаўленых Вышэйшай судовай палатай; прымае рашэнні па пытаннях, прадметам якіх з'яўляецца канстытуцыйнасць партый (арт. 135 Канстытуцыі Рэспублікі Малдова).

4. «Але калі дазволіць мне час, я буду спрабаваць унесці змены ў Канстытуцыю, якія ліквідуюць Канстытуцыйны суд».

Хочацца спадзявацца, што «час» не дазволіць здзейсніць гэту чорную справу! Вы замахнуліся на Канстытуцыю, паколькі менавіта яна вызначыла наш дэмакратычны выбар і ў якасці гаранты такога развіцця прадугледзела ўтварэнне Канстытуцыйнага суда.

Няўжо вы, Юрый Георгіевіч, збіраецеся павярнуць гісторыю назад і на самай справе ліквідаваць орган, закліканы быць абаронцам Канстытуцыі і канстытуцыйных правоў грамадзян?

Скажыце шчыра, чым ён вам перашкаджае, чым непажаданы? Можа быць, Канстытуцыйны суд недастаткова эфектыўна выконваў свае функцыі і дазваляў парушаць Канстытуцыю? Калі гэта так, то давайце разам падумаем, як умацаваць статус гэтага органа, каб нікому не было панадна прымаць прававыя акты, што разыходзяцца з Канстытуцыяй.

Наогул цікава, як вы збіраецеся сумясціць ідэю ліквідацыі Канстытуцыйнага суда з перспектывай уступлення Беларусі ў Савет Еўропы? Бо не сакрэт, што эксперты Савета Еўропы разглядаюць наяўнасць Канстытуцыйнага суда як важны фактар прагрэсу, дэмакратыі, законнасці. Да таго ж яшчэ восенню 1994 года наш суд прыняты ў якасці асацыіраванага члена Еўрапейскай канфедэрацыі канстытуцыйных судоў, а ў маі гэтага года будзе вырашацца пытанне аб прыёме яго пастаянным членам гэтай аўтарытэтнай міжнароднай арганізацыі.

Ці не атрымліваецца ў вас так, што правая рука не ведае, што робіць левая? З аднаго боку, вы заклікаеце «зрабіць усё, каб восенню стаць членам Савета Еўропы», а з другога — гаворыце, што «калі дазволіць час», ліквідуеце Канстытуцыйны суд.

5. «Прэзідэнт жа не парушаў Канстытуцыю ў плане сутнасці ўказаў, але парушыў форму, бо не меў такога права...»

Як юрыст вы павінны ведаць, што юрыдычная форма адыгрывае не апошнюю ролю ў юрыспрудэнцыі. Парушэнне формы, у якой павінен прымацца нарматыўны акт, азначае парушэнне і самога закона. Напрыклад, калі ў Канстытуцыі прадугледжана, што рэспубліканскі бюджэт зацвярджае Вярхоўны Савет, то ніхто іншы не можа ўносіць у бюджэт удакладненні і дапаўненні. Гэта — прэрагатыва выключна Вярхоўнага Савета як вышэйшага прадстаўнічага пастаянна дзеючага і адзінага заканадаўчага органа дзяржаўнай улады і ён сваё права рэалізуе шляхам прыняцця закона.

Сваім Указам ад 12 ліпеня 1995 года № 267 «Аб удакладненні бюджэту Рэспублікі Беларусь на 1995 год і часовых мерах па скарачэнню бюджэтных расходаў» Прэзідэнт фактычна падмяніў Вярхоўны Савет, паколькі ўнёс удакладненні ў даходную і расходную часткі бюджэту. Таму суд прызнаў асобныя палажэнні гэтага ўказа неадпаведнымі Канстытуцыі і закону.

Акрамя таго, некаторыя ўказы Прэзідэнта былі прызнаны судом супярэчнымі Канстытуцыі і па свайму зместу. Гэта, у прыватнасці, датычыць указаў ад 1 верасня 1995 года № 350 «Аб некаторых пытаннях рэгулявання працоўнай дзейнасці і пенсіённага забеспячэння грамадзян» з наступнымі змяненнямі і дапаўненнямі; ад 19 верасня 1995 года № 383 «Аб правядзенні рэформы органаў мясцовага кіравання і самакіравання» і інш.

6. «Паверце мне, што гэтыя 9 суддзяў нейкай небяспекі прэзідэнцкай уладзе і ўвогуле ўладзе ў краіне ўяўляць не могуць».

Сапраўды, ніякай небяспекі і пагрозы для дзяржавы Канстытуцыйны суд не ўяўляе і ніколі ўяўляць не будзе. Наадварот, суд умацоўвае ўладу, прымушае яе дзейнічаць у рамках Канстытуцыі, захоўваць канстытуцыйныя правы грамадзян.

Незразумела толькі адно, чаму вы, Юрый Георгіевіч, хочаце ліквідаваць Канстытуцыйны суд, калі ён прыносіць краіне толькі карысць і ўмацоўвае яе міжнародны прэстыж?

7. «Тое, што Канстытуцыйны суд дзейнічаў у палітычнай, а не ў юрыдычнай сферы, — для мяне зразумела».

Для вас «зразумела», а для мяне і большасці маіх калег — гэта «незразумела».

Не можа Канстытуцыйны суд займацца палітычнай дзейнасцю. Для гэтага няма ніякіх падстаў: ні прававых, ні фактычных. У палітычных партыях ніхто з суддзяў не знаходзіцца. Справы суд разглядае, грунтуючыся толькі на Канстытуцыі, законах і міжнародна-прававых актах, ратыфікаваных Рэспублікай Беларусь.

Вядома, «прышыць» палітыку ў свой час у нас маглі. Але ці трэба звяртацца да падобных метадаў цяпер, калі мы будуем дэмакратычную прававую дзяржаву і збіраемся ўступіць у Савет Еўропы?

Пакідаю без рэагавання «неправавое» сцвярджэнне: «А іх (Канстытуцыйнага суда. — **М. П.**) пазіцыя на 25 і 50 працэнтаў увогуле вартая смеху». Пагадзіцеся, Юрый Георгіевіч, што такія прыёмы палемікі кодэксам гонару забаронены!

Інтэрв'ю з Ю. Г. Малумавым пакідае адкрытым галоўнае пытанне: чаму ж хочуць ліквідаваць Канстытуцыйны суд і каму ён так перашкаджае?

Хацелася б пачуць па гэтым пытанні думкі дэпутатаў Вярхоўнага Савета, а таксама іншых зацікаўленых чытачоў. Давайце разам шукаць ісціну і думаць аб нашым заўтрашнім дні.

Міхаіл ПАСТУХОЎ,
суддзя Канстытуцыйнага суда Рэспублікі Беларусь, доктар юрыдычных навук, прафесар, заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь.

«Звязда» гатова прадаставіць свае старонкі для працягу дыскусіі па складаных і неадназначных пытаннях, узнятых намеснікам Старшыні Вярхоўнага Савета Ю. Малумавым і суддзёй Канстытуцыйнага суда М. Пастуховым.

РЭХА ПУБЛІКАЦЫІ

«Сказ пра сертыфікат»

«Сказ пра сертыфікат» Сымона Свістуновіча, апублікаваны ў газеце 18 студзеня г. г. — гэта не падмацаваны фактамі толькі аўтарскі пункт погляду на праблемы продажу якасных прадуктаў харчавання, які агулам дыскрэдытуе работу гандлёвай галіны па выкананню Закона аб ахове правоў і інтарэсаў спажыўцоў.

Раздзяліць як-небудзь з аўтарам артыкула можна яго думкі толькі адносна неарганізаванага гандлю прыватнымі асобамі. Але разглядаць праблему неабходна хутчэй з пункту погляду этыкі тых пакупнікоў, якія, не баючыся магчымых вынікаў, набываюць прадукты харчавання ў выпадковых прадаўцоў. Навядзенне парадку тут знаходзіцца ў кампетэнцыі праваахоўных органаў.

Увесь астатні гандаль рэспублікі рэгулюецца і кантралюецца адпаведнымі органамі розных узроўняў і ведамстваў.

Зыходзячы з выкладзенага, Міністэрства гандлю заяўляе наступнае.

Пачынаючы з 1994 года сумеснай пастановай Міністэрства аховы здароўя і Камітэта па стандартызацыі ад 4.08.94 № 9/7 на тэрыторыі рэспублікі рэалізацыя прадтавараў без суправаджальных дакументаў, якія пацвярджаюць іх якасць і бяспеку, забараняецца. Гэтае рашэнне датычыцца ўсіх, незалежна ад формаў уласнасці, гандлёвых арганізацый, фізічных і юрыдычных асоб, якія ажыццяўляюць гандлёвую дзейнасць, і падлягае безумоўнаму выкананню, яно знаходзіцца пад пастаянным кантролем адпаведных органаў, і ў выпадку парушэння гэтых патрабаванняў вінаватыя праследуюцца па закону.

Асноўнымі дакументамі, якія пацвярджаюць бяспечнасць тавараў на тэрыторыі рэспублікі, з'яўляюцца:

пасведчанне аб якасці ці адзнака ў таварна-транспартнай накладной, якая пацвярджае якасць тавару, выдадзеныя таваравытворцам;

пасведчанне аб дзяржаўнай гігіенічнай рэгістрацыі, выдадзенае Міністэрствам аховы здароўя фірме-вытворцу ці яе афіцыйнаму прадстаўніку;

сертыфікат адпаведнасці ці пасведчанне аб яго прызнанні.

Зыходзячы з гэтага, аптовыя і рознічныя гандлёвыя прадпрыемствы ўсіх формаў уласнасці прымаюць ад вытворцаў (пастаўшчыкоў) тавары толькі пры наяўнасці аднаго з пералічаных дакументаў, якія пацвярджаюць якасць, і адпускаюць тавары (незалежна ад звённасці таварапрасоўвання), суправаджаючы іх копіяй гэтых дакументаў з нанясеннем сапраўднай пячаткі адпраўніка. Іншага быць не павінна.

Разам з тым, кантрольныя праверкі выяўляюць адзінкавыя выпадкі парушэння гэтых правілаў, часцей за ўсё на прадпрыемствах недзяржаўных формаў уласнасці, але гэтыя выключэнні не могуць быць падставай для той «безвыходнай сітуацыі», якой характарызуе аўтар артыкула становішча спраў у рэспубліцы.

М. ЕЎТУХОЎСКІ,
намеснік міністра гандлю.

ПРАВЕРЦЕ ПРАВІЛЬНАСЦЬ АФАРМЛЕННЯ АБАНЕМЕНТА

На абанеменце павінен быць пастаўлены адбітак касавай машыны.

Пры афармленні падпіскі (пераадрасоўкі) без касавай машыны на абанеменце праастаўляецца адбітак каляндарнага штэмпеля аддзялення сувязі. У гэтым выпадку абанемент выдаецца падпісчыку з квітанцыяй аб аплаце кошту падпіскі (пераадрасоўкі).

Для афармлення падпіскі на газету або часопіс, а таксама для пераадрасавання выдання бланк абанемента з даставачнай карткай запаўняецца падпісчыкам чарнілам, разборліва, без скарачэнняў, адпаведна ўмовам, выкладзеным у каталогах.

Запаўненне месячных клетак пры пераадрасаванні выдання, а таксама клеткі «ПВ-МЕСЦА» робіцца работнікамі прадпрыемстваў сувязі.

НОВАЯ МАРКА СА СТАРЫМ МАЛЮНКАМ

Першую ў 1996 годзе паштовую марку выпусціла Міністэрства сувязі і інфарматыкі краіны.

Гэта стандартная мініяцюра вартасцю 200 рублёў. Вялікі тыраж дасць магчымасць забяспечыць такімі маркамі ўсе аддзяленні сувязі, якім не хапала менавіта гэтага наміналу, неабходнага для аплаты простых пісьмаў і паштовак, што адпраўляюцца па Беларусі. Вось толькі малюнак на марцы зноў паўтарае папярэднія (абеліск на плошчы Перамогі), што не прынята рабіць у іншых краінах.

Уладзімір ЛАРЫЁНАЎ.

ПАЖАРАЎ СТАЛА НА ТРЭЦЬ БОЛЬШ

Як паведамілі нашаму карэспандэнту ва ўпраўленні ваенізаванай пажарнай службы Беларусі, за мінулы месяц у нашай краіне адбылося 1611 пажараў.

Сумна, але факт: у параўнанні са студзенем 1995 года колькасць пажараў узрасла амаль на трэць. Адпаведна, на 179 працэнтаў узрос матэрыяльны ўрон, і на 21 чалавека — колькасць ахвяр. Па-ранейшаму, найбольш распаўсюджанай прычынай пажараў (58 працэнтаў) называецца курэнне ў нецвярозым стане. Апроч таго, даволі часта ўзгаранні адбываліся ў выніку карыстання няспраўнымі электрабытавымі прыборамі (20 працэнтаў) і печамі (14 працэнтаў).

Сяргей ГРЫБ.

КАНФЛІКТЫ

АКАДЭМІЯ НАВУК НЕ НАСТОЛЬКІ БАГАТАЯ, КАБ ПЛАЦІЦЬ ЗА КОЖНУЮ КНІГУ ДВАЙНУЮ ЦАНУ

Інфармацыя аб закрыцці выдавецтва «Навука і тэхніка» і друкарні імя Ф. Скарыны Акадэміі навук Беларусі, распаўсюджаная ў СМІ агенцтвам РІД, не прайшла незаўважанай. Але каментарыі, якія з'явіліся ў прэсе, не ва ўсім супадаюць з рэальнымі падзеямі і фактамі. Звернемся да іх.

На думку многіх, да такога драматычнага канца прывёў канфлікт паміж друкарняй і ЗП «Пікорп» з удзелам прэзідыума АНБ. Першы дагавор аб сумеснай дзейнасці з ЗП «Пікорп» былы кіраўнік «Скарыны» В. Васілеўскі заключыў 18 снежня 1991 года. Ніякіх узгадненняў ні з прэзідыумам АНБ, ні асабіста з кіраўнікамі акадэміі ён не праводзіў. Гэта не абавязкова было і рабіць, паколькі заканадаўства на той час дазваляла суб'ектам гаспадарання займацца сумеснай дзейнасцю з замежнымі партнёрамі амаль без абмежаванняў. Аднак у сакавіку 1993 г. прэзідыум акадэміі даручыў камісіі на чале з віцэ-прэзідэнтам АНБ Р. Гарэцкім прааналізаваць дагавор ад 18 снежня і вынесці на бюро свае прапановы. Вердыкт камісіі: дагавор з ЗП «Пікорп» недастаткова ўлічвае дзяржаўныя інтарэсы пры выкарыстанні дзяржаўнай маёмасці.

Пастановай ад 28 чэрвеня 1993 г. бюро прэзідыума АНБ загадала кіраўнікам друкарні пачаць перамовы з кіраўніцтвам «Пікорпа» аб унясенні змяненняў у дзеючы дагавор. У выніку бакі сышліся на тым, што замежнае прадпрыемства будзе штомесяц плаціць друкарні 16 тысяч долараў. І вось якраз пасля заключэння новага дагавора пачаліся канфлікты паміж яго ўдзельнікамі. Прадметам спрэчак стаў памер вытворчых плошчаў, якія друкарня павінна прадаставіць ЗП «Пікорп».

Вырашыць канфліктную сітуацыю спрабаваў прэзідыум АНБ, не займаючы пры гэтым пазіцыю ніводнага з бакоў. Нейтралітэт прэзідыума работнікі друкарні, а затым і Службы кантролю Прэзідэнта РБ, расцанілі як праяўленне падтрымкі «Пікорпа». Але калі б гэта было так, то кіраўнікі ЗП не сталі б звяртацца ў Вышэйшы гаспадарчы суд РБ за вырашэннем спрэчных пытанняў. У выніку судовага разбору (студзень-люты 1995 г.) ВГС РБ устанавіў, што ні аб якой сумеснай дзейнасці друкарні імя Ф. Скарыны і ЗП «Пікорп» гаворка ў дагаворы ад 1.05.94 г. не ідзе, фактычна ён з'яўляецца дагаворам арэнды. Суд вызначыў памер арандуемых ЗП плошчаў і памер арэнднай платы за іх (7 тысяч долараў штомесяц), кіруючыся адпаведным заканадаўствам. Як бачым, не прэзідыум АНБ у два разы паменшыў выплату «Пікорпа» друкарні, аб чым заяўляюць яе работнікі, а суд. Прэзідыум жа ўнёс змяненні ў дагавор згодна з рашэннем ВГС РБ. Работнікі «Скарыны» звярнуліся ў ВГС з просьбай перагледзець справу ў парадку нагляду і пакінуць ранейшы памер арэнднай платы.

Тым часам прэзідыум акадэміі рабіў захады па выпраўленню становішча. Кіраўнікам ЗП «Пікорп» было прапанавана акрамя арэнднай платы аплачваць таксама кошт паліграфічнага выканання кніжна-часопіснай прадукцыі выдавецтва ў аб'ёме 3,5 мільёна лістоў-адбіткаў у год, што цалкам кампенсавала б узнікшую ў выніку рашэння суда розніцу. Амерыканскі бок з гэтым пагадзіўся, пакуль... Пакуль не пачаўся новы віток канфрантацыі з кіраўніцтвам і работнікамі друкарні, якія, не чакаючы адказу ВГС на сваю апеляцыю, распачалі супраць «Пікорпа» незаконныя, на наш погляд, дзеянні.

Асабліва абвастрыліся адносіны паміж бакамі, калі галоўны інжынер друкарні С. Пуцілаў падпісаў 19 мая 1995 г. загад аб адключэнні электраэнергіі ад абсталявання і забароне допуску супрацоўнікаў «Пікорпа» да рабочых месцаў, а 25 мая быў арганізаваны незаконны страйк. У справу ўмяшаліся міліцыя і пракуратура Першамайскага раёна. У АНБ паступілі патрабаванні ад Вярхоўнага Савета РБ, Адміністрацыі Прэзідэнта РБ, да якіх далучыліся Міністэрства знешнеэканамічных сувязей РБ і пасольства ЗША, неадкладна ліквідаваць хваляванні, арганізаваныя ў друкарні. Пастановай бюро прэзідыума АНБ і загадам прэзідэнта акадэміі Л. Сушчэні кіруючыя работнікі друкарні С. Пуцілаў, У. Паўлюкевіч, Я. Драпачка і Ж. Данілава былі звольнены па артыкулу 254 КЗаП РБ. (Праўда, потым суд апратэставаў гэта рашэнне.) Па ўласнаму жаданню звольніўся яе дырэктар У. Карповіч. Аднак супрацоўнікі Службы кантролю Прэзідэнта РБ антызаконныя дзеянні гэтых людзей характарызуюць як абарону інтарэсаў дзяржаўнага прадпрыемства, а іх звальненне — як помсту з боку акадэміі за такія дзеянні. Пакінем гэта на сумленні кантралёраў.

А тым часам ВГС РБ пастановай ад 8.06.95 г. пакінуў у сіле сваё ранейшае рашэнне, удакладніўшы толькі, што дагавор лічыцца змененым з дня вынясення судом рашэння (г. зн. з 1.02.95 г.), а не з моманту яго заключэння, як пазначана ў першай судовай пастанове. Работнікі друкарні падалі пратэст на рашэнне ВГС РБ у Пракуратуру РБ. Але 20.06.95 г. адтуль прыйшоў ліст за подпісам намесніка Генеральнага пракурора РБ І. Сашчэкі, у якім гаворыцца, што прынятае, а затым і ўдакладненае судом рашэнне адпавядае заканадаўству і матэрыялам судовай справы, таму падстаў для яго апратэставання Пракуратура РБ не знаходзіць.

Вынесла сваё рашэнне і Служба кантролю Прэзідэнта РБ па выніках праверкі выканання дзеючага заканадаўства пры заключэнні дагавораў, правядзенні сумеснай дзейнасці і арэндных адносінаў паміж друкарняй імя Ф. Скарыны і ЗП «Пікорп»: забраць у замежнага прадпрыемства 79007 долараў за недабор па аплаце арэнды, з якіх 90 працэнтаў павінна пайсці ў мясцовы бюджэт, а 10 працэнтаў — на рахунак Службы кантролю. Але амерыканцы мелі на гэты конт іншую думку і абскардзілі рашэнне Службы кантролю ў ВГС РБ. Іх матывацыя — Служба кантролю перавысіла свае паўнамоцтвы, прымаючы такое рашэнне, якое да таго ж не адпавядае беларускаму заканадаўству і супярэчыць уступіўшым у сілу пастановам ВГС РБ.

Дасканала разгледзеўшы гэтую справу, суд прызнаў слушнасць меркаванняў ЗП «Пікорп». Дакумент Службы кантролю Прэзідэнта РБ такім чынам прызнаны неправамоцным. Аднак пра ўсё гэта работнікі друкарні чамусьці не жадаюць гаварыць, асабліва калі спасылаюцца на высновы Службы кантролю.

Разам з тым за радкамі пастановы прэзідыума АНБ «у сувязі з рэзкім ростам сабекошту выдання навуковай літаратуры, што прывяло да значнага скарачэння яе выпуску, крайне ўстарэлай тэхнічнай базай, адсутнасцю грашовых сродкаў для мадэрнізацыі абсталявання... ліквідаваць выдавецтва «Навука і тэхніка» і друкарню імя Ф. Скарыны з 1 сакавіка 1996 г.» не стаіць разглядаемы канфлікт. Хаця пэўны ўплыў на сітуацыю, што склалася ў выдавецтве і друкарні, ён аказаў. Сёння кошт выдавецкіх паслуг у названых установах настолькі высокі, што ад іх адмовіліся многія заказчыкі, у выніку чаго аб'ём выпускаемай кніжна-часопіснай прадукцыі друкарні імя Скарыны з кожным годам няўхільна зніжаецца. Зараз кожны заказчык шукае месца, дзе яму надрукуюць кнігу альбо часопіс хутчэй, танней і больш якасна. Друкарня акадэміі не можа задаволіць ніводзін з гэтых паказчыкаў. Але гэта, відаць, мала хвалявала яе кіраўнікоў. І калі ў пачатку 90-х гадоў Міністэрства культуры і друку РБ выдзеліла «Скарыне» добрую друкарскую машыну, яе перапрадалі камерцыйным структурам.

Мне здаецца, работнікі друкарні проста не маглі сабе ўявіць, што АНБ можа адмовіцца ад іх паслуг і таму дыктавалі ёй свае ўмовы. Дайшло да таго, што зараз сабекошт кніжнай прадукцыі ў акадэмічнай друкарні ў два разы вышэй, чым у любой іншай. За кошт гэтага яна і атрымлівае кожны год прыбытак. У 1994 годзе ён склаў 179 мільёнаў рублёў, хаця вытворчыя магутнасці былі выкарыстаны ўсяго на 10(!) працэнтаў. Атрымліваецца, што прадпрыемства год практычна не працавала, а балансавы прыбытак унь які. Сапраўды залатымі атрымліваюцца кнігі для Акадэміі навук у роднай друкарні, якая мае штогадовыя мільённыя прыбыткі, а мадэрнізаваць абсталяванне не здолела. Панізіць сабекошт сваёй прадукцыі таксама не хоча ці не можа. І няма нічога дзіўнага, што АНБ не патрэбна такая друкарня і яна яе закрывае.

Аляксандр ЮРЫН,
намеснік рэдактара газеты «Навіны Акадэміі навук Беларусі».

АД РЭДАКЦЫІ. ***Такім чынам, мы пазнаёмілі чытача з пазіцыямі абодвух бакоў. (Пункт погляду работнікаў друкарні быў прыведзены ў нумары за 22 снежня мінулага года.) Як бачым, у кожнага з іх свая праўда. Можна каменціраваць, але канфлікт зайшоў так далёка, што газета тут ужо нікога не памірыць. Хоць, шчыра кажучы, вельмі гэтага хочацца. І за навуку, якая, у рэшце рэшт, можа застацца без друкаванага слова, крыўдна, і людзей шкада.***

Мы пісалі, што работнікі друкарні стукаюцца ў самыя высокія дзверы. Будуць нейкія змены — раскажам.

ЗАКОНЫ НЕ ПАВІННЫ ПАРУШАЦЦА

Прыём наведвальнікаў па асабістых пытаннях правёў першы намеснік Старшыні Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь Васіль Новікаў.

Вырашэнне праблем, з якімі звярнуліся да В. Новікава грамадзяне, з'яўляецца, як правіла, прэрагатывай структур іншых галін улады: мясцовых выканаўчых камітэтаў, судовых органаў, пракуратуры. Аднак людзі, якія прыйшлі ў Вярхоўны Савет, часта пачыналі свой расказ словамі: «Я пабываў ужо ў тых інстанцыях».

Усе заявы ўважліва разглядаюцца, у некаторых выпадках да вывучэння [illegible] пастаянныя парламенцкія камісіі.

Працяглая размова ў першага намесніка Старшыні Вярхоўнага Савета адбылася з прадстаўнікамі ваенных пенсіянераў. Яны выказалі занепакоенасць [illegible] Закона Рэспублікі Беларусь «Аб пенсійным забеспячэнні ваеннаслужачых». [illegible] Прэзідэнт А. Лукашэнка, што «перад законам павінны быць усе роўныя», незалежна ад займаемай пасады і звання. Трэба паставіць кропку ў спрэчцы, якімі ж законамі [illegible] кіравацца: у тым выглядзе, як яны прыняты Вярхоўным Саветам, або ў тым, як яны зменены прэзідэнцкімі ўказамі і пастановамі Кабінета Міністраў».

В. Новікаў падкрэсліў, што павінна [illegible] формула «закон ёсць закон». Кіраўніцтва Вярхоўнага Савета робіць намаганні менавіта ў такім напрамку.

Прэс-служба Вярхоўнага Савета — БЕЛТА.

НА РЫНКУ НЕРУХОМАСЦІ ПАВІННЫ ПРАЦАВАЦЬ САПРАЎДНЫЯ ПРАФЕСІЯНАЛЫ

Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва разам з [illegible] распрацавалі праект нарматыўна-метадычнай дакументацыі «Аб ліцэнзаванні дзейнасці па аказанні пасрэдніцкіх паслуг пры заключэнні здзелак з жыллём у Рэспубліцы Беларусь», які, мяркуецца, пачне працаваць з 1 ліпеня 1996 года.

Неабходнасць прыняцця дакумента прадыктавана шэрагам істотных фактараў. Апошнім часам у краіне з'явілася [illegible] мноства агенцтваў па [illegible] з нерухомасцю (так званыя «кватэрныя бюро»), актывізаваліся «чорныя» маклеры, якія займаюцца куплей, абменам і продажам кватэр.

[illegible] кім ажыятажы ў рады камерсантаў, якія займаюцца жыллём, могуць трапіць людзі, якія не толькі некампетэнтныя ў гэтай сферы дзейнасці, але і не зусім сумленныя. [illegible]

Дакументы, што рэгулююць [illegible] дзейнасць на рынку жылля, [illegible] рынак нерухомасці [illegible]

Сяргей КУРКАЧ.

НЕБЯСПЕЧНЫ ЗЛАЧЫНЕЦ УВАРВАЎСЯ Ў БАЛЬНІЦУ

Тэлефонны званок з хірургічнага аддзялення Чавускай райбальніцы ў дзяжурную часць РАУС прымусіў мясцовую міліцыю прыняць экстрэмальныя меры. Загадчык у кароткай размове паведаміў, што невядомы мужчына ўварваўся ў памяшканне бальніцы ў [illegible] стане і, пагражаючы нажом, збіў медсястру.

Памочнік дзяжурнага старшына міліцыі А. [illegible] і дзяжурны вадзіцель А. [illegible] сутыкнуліся з хуліганам на лесвічнай пляцоўцы. Апошні не стаў шмат разважаць і паспрабаваў уцячы праз лабірынт калідораў [illegible] аддзялення. Але, [illegible], пачаў пагражаць міліцыянерам, імітуючы адначасова гатоўнасць да стральбы.

Супрацоўнікі міліцыі разгадалі манеўр злачынцы, у руках якога быў звычайны нож. Ён быў абяззброены і даастаўлены ў РАУС. Тут і высветлілася, што хуліган з 22 снежня 1995 года знаходзіцца ў рэспубліканскім вышуку за [illegible]. Злачынца мае пры сабе фальшывыя дакументы.

Віктар КУПРЭЕЎ, прэс-група УУС Магілёва.

«ЗАБІНТАВАЛІСЯ»

Акцыянернае таварыства «Стужка», раней вядомае як Магілёўская стужкаткацкая фабрыка, асвоіла з дапамогай нямецкіх калег выпуск перавязачнага матэрыялу.

[illegible] бінтаў, пастаўляемых на Беларусь з Іванава, першы айчынны ўзор адрозніваецца шэрагам пераваг. З нашага бінта не вылазяць ніткі, [illegible] Лепш убірае вільгаць. Выпускаецца шырынёй ад чатырох да шаснаццаці сантыметраў.

Новы бінт [illegible] на рэспубліканскім з'ездзе хірургаў і атрымалі высокую адзнаку медыкаў. [illegible] Расійскія ткачы, [illegible] пра канкурэнта, крыху знізілі цану свайго бінта. [illegible]

Васіль ЛЕЎЧАНКА.

КРЫК ДУШЫ

НАС НІХТО НЕ ЧУЕ

Справа вось у чым. Сёння 1 лютага, а зарплату мы не атрымалі яшчэ за снежань 1995 года. І не ведаем, калі яе атрымаем. Я, ды і астатнія настаўнікі нашай школы, апынуліся ў складаным становішчы.

[illegible] каб у тэрмін да 10—20 студзеня разлічыцца за ацяпленне і электрычнасць, бо інакш адключаць. А пазычаць трэба зарплату. Звярталіся да раённага кіраўніцтва, [illegible]

Восеньню мінулага года мы напісалі аб усім гэтым ліст Прэзідэнту краіны, [illegible]

Зароблены грошы затрымліваюць кожны раз на месяц і больш. [illegible]

[illegible] стаўкі. Магчымы выбух. Больш за ўсё прыкрае тое, што мы [illegible]

Што рабіць? Куды звяртацца? Можа, вы падкажаце? Я не прашу ў вас дапамогі.

Прашу толькі: дапамажыце ўсім тым, хто [illegible]

Іван МАРТЫНАЎ, настаўнік матэматыкі, стаж 40 гадоў.

в. Канвелішкі, Воранаўскі раён.

ПОДЗВІГ

Полымя высвечвае геройства адных і баязлівасць другіх

У нас у краіне ёсць? Калі нехта здзейсніць подзвіг, [illegible]

[illegible]

Сяргей ХРЫПАЧ, прэс-цэнтр МУС.

СКАНДАЛЫ

КУМПЯЧКІ «ПАЛЯЦЕЛІ» — МАГІЛЯЎЧАНЕ АБЛІЗВАЮЦЦА

Магіляўчане ў паніцы. Гучнагаварыцель на Цэнтральным рынку папярэдзіў наведвальнікаў: не купляйце курыныя кумпячкі. Пайшлі розныя чуткі, сярод якіх была і такая, што гэта птушынае мяса выклікае анкалагічныя захворванні.

Божа, а мы ўжо з'елі.

Звычайныя спажыўцы, у каго кашалёк набіты не надта туга, ходзяць па прадукты менавіта на рынкі. Там, у адрозненне ад нядаўніх савецкіх часоў, зараз танней, чым у дзяржаўным гандлі.

І вось такое страшнае папярэджанне.

Для чалавека, які хоць нешта цяміць у праблеме, яно не было сенсацыйным. У свой час мне давялося ўнікнуць у прычыны прыкладна такой жа шуміхі, выкліканай курынымі яйкамі. Нібыта сальманелёзнымі. Высветлілася, што заразы там не было, а проста запусцілі «вутку» канкурэнты мясцовага птушкапрома.

На здольнасці Настрадамуса, паверце, не прэтэндую. Але таго, што адбылося, чакаў. Няхай чытач звернецца да публікацыі «Чужахлеўны сіндром», змешчанай у «Звяздзе» ў студзені, і стане маім заканамерным саюзнікам у высновe: за таннай камерцыйнай гарэлкай пайшло ў нас знішчэнне і ўсіх іншых тавараў, якія прадпрымальнікі здабывалі за мяжой не на карысць нашым вытворцам. Канкурэнцыя аказалася для апошніх такой жа непатрэбнай, як прэзерватыў для імпатэнта. А падтрымліваць збанкрутаваных суайчыннікаў трэба. Значыць, што? «Пятроў» падроблены, а кумпячкі «заразныя»? Ату камерсантаў!

Такі сацыяльны заказ (меркаванне, падкрэслю, асабіста маё) мясцовыя сродкі масавай інфармацыі ўзяліся выконваць з энергіяй, дастойнай лепшага прымянення. Распаўсюджана пісьмо галоўнага ветэрынарнага інспектара Магілёва Сяргея Фядотава са, здавалася б, безапеляцыйным сцвярджэннем: «Курыныя кумпячкі: кропку паставіла ветінспекцыя».

Ды няма там ніякай кропкі, хоць праз мікраскоп глядзі. Ёсць напамінак пра элементарныя патрабаванні наконт таго, што мяса і мясапрадукты, якія паступаюць на рынкі, падлягаюць абавязковай праверцы ў лабараторыях ветсанэкспертызы. А шкодныя тыя самыя кумпячкі ці не — падобна, ніхто не ведае. Забаранілі іх прадаваць на падставе складанай «бухгалтэрыі», ад якой у прадпрымальнікаў адпадзе ўсякая ахвота займацца сумленным бізнесам. Аказваецца, на экспарт-імпарт прадуктаў і сыравіны жывёльнага паходжання павінны быць ветэрынарны сертыфікат або пасведчанне, а гэтыя дакументы — ні больш, ні менш — выдаюцца з дазволу ажно самога ўрада.

Цікава, ачуняў бы ці не знясілены Марэсьеў, калі б дзед, які зарэзаў для яго апошнюю курыцу, панёсся б спачатку ў Крэмль па адпаведны дазвол?

І ці глядзіць «урад» тэлебачанне, якое два гады запар круціла рэкламны ролік пра стройны клін кумпячкоў, па якім цэліўся з рагаткі нейкі вясковы шалапут?

Жарты жартамі, але, каб надаць важкасці ўвогуле правільным, але «бесфактурным» аргументам, магіляўчанам прапанавалі сцвярджэнні дырэктара нейкай Тамілінскай птушкафабрыкі Расійскай Федэрацыі.

Аказваецца, па сваёй недасведчанасці я з'еў столькі курыных лапак і толькі напрыканцы жыцця даведаўся, што рабіць гэтага нельга было ні ў якім разе. Аказваецца — цытую — «Курыца на птушкафабрыцы большую частку часу праводзіць стоячы: у клетках так цесна, што ёй няма куды сесці, і ўсе шкодныя рэчывы асядаюць у тканках яе лап — у тым, што пазней стане курынымі кумпячкамі...»

Людзі, а халадцу ў рот больш не бярыце. Калі ён, вядома, не з адных толькі свіных вушэй. Не купляйце капыты буйной рагатай жывёлы, якімі забіты прылаўкі нашых гастраномаў. Захоўвайце жывёльныя ногі, як гэта робяць амерыканцы, у якасці стратэгічнага прадукту, а ў ежу, згодна з парадай расійскага дырэктара, ужывайце толькі курыныя крыльцы. Во будзе лафа! Крыло бройлера — сабе, тушку — сабакам. Заможна жывём.

Вядома, на ролю трацейскага суддзі ў такой скандальнай сітуацыі не замахваюся. Але пункт гледжання і іншага зацікаўленага боку, калі плюралізм яшчэ не адменены, абавязаны выкласці. На думку віцэ-прэзідэнта Магілёўскай асацыяцыі прамыслоўцаў і прадпрымальнікаў Юрыя Падольскага, такія гісторыі адбываюцца ў нас перыядычна. То, кажуць, «снікерсы» атручаныя, то памперсы хударыя, то кава са шкоднымі рэчывамі, то гарэлка, якая танней за беларускую, па якасці горшая за дыхлафос. Нас пераконваюць, што ўвесь свет, у якога прылаўкі ломяцца ад тавараў, толькі аб тым і марыць, каб нас атруціць і яшчэ зарабіць на гэтым.

Бясспрэчна, прадукты бываюць няякасныя. Але навошта агулам ахайваць рынак і пужаць насельніцтва?

Увесь свет не есць сініх бройлераў па цане ікры, а танныя, смачныя курыныя кумпячкі. Спадары капіталісты клапоцяцца аб сваім здароўі лепш, чым мы, і іхнія тэхналогіі, у тым ліку і па вырошчванню курэй, праходзяць на бяспечнасць найстражэйшыя экспертызы. У іх там, у адрозненне ад нас, створана цэлая сістэма абароны правоў спажыўцоў і пакарання бракаробаў. У іх канкурэнцыя вытворцаў за рынкі збыту, што з'яўляецца важнейшай гарантыяй якасці...

Як бы там ні было, а рэкламны хлопец, відаць, недарэмна махаў рагаткай. Кумпячкі ў свой замежны вырай, на жаль, адляцелі. Хто наступны?

Васіль ЛЕЎЧАНКА.

Акцыянеры «Гроднаабутку» вырашылі забраць у былой «эліты» незаконна набытыя акцыі. Ці атрымаецца?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

аўкцыёнаў, таму яны былі незаконнымі. Тым не менш, працэс пайшоў. Рабацягам абяцалі залатыя горы, аднак далёка не ўсе з іх атрымалі нават належны мізэр акцый. На сходзе выступіла адна жанчына, якая 20 гадоў адпрацавала на прадпрыемстве. На момант, калі быў пік прыватызацыйнага працэсу, яна знаходзілася ў дэкрэтным водпуску. І вось звяртаецца жанчына да аднаго з буйнейшых акцыянераў, пытаецца, чаму пра яе забыліся. Той усміхаецца: «Ты што, акцый захацела?» Яшчэ адзін рабочы пазычае грошай у сваякоў і ідзе ў бухгалтэрыю, каб купіць яшчэ трохі акцый — няма іх. А потым чалавек даведваецца, што для некаторых асоб яны былі і праз месяц.

Пасля гэтага галоўныя акцыянеры працягваюць сцвярджаць, што попыту на акцыі не было і таму, маўляў, яны былі вымушаны іх набыць, каб інвесціраваць роднае прадпрыемства. Пракуратура паведаміла на сходзе наступныя лічбы. Нягледзячы на існаваўшыя абмежаванні на пакупку акцый (для фізічных асоб — не больш як 50 штук), М. Юркевіч набыў 460 акцый, яго жонка — 366 (гэта сям'я стала трымальнікам 10-працэнтнага «пакета»), былы намеснік дырэктара па эканоміцы Г. Манкевіч — 342. Адсюль і дывідэнды: каму 40 тысяч рублёў альбо ўвогуле «дуля з макам», а каму і 6 мільёнаў.

Лагічна запытацца: а як жа дэкларацыі аб даходах? Ды ніяк, «забыліся» пра іх і толькі за тыдзень да сходу прадставілі адпаведныя даведкі, якія, лічыць пракуратура, не пацвярджаюць сумы, заплачаныя за вышэйпамянёную колькасць акцый.

Сход прагаласаваў за тое, каб вярнуць акцыянернаму таварыству незаконна набытыя акцыі. Аднак ці атрымаецца — сказаць пакуль цяжка.

Таксама невядома, ці будуць вернуты дывідэнды з гэтых акцый. Хутчэй за ўсё, без суда тут не абыдзецца.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Малюнак. Леаніда Разладава.

НА РАДЗІМЕ КАНТА П'ЮЦЬ З БЕЛАРУСКАЙ «КРЫНІЦЫ», АЛЕ ТАМ НЕ ЎСІМ ГЭТА ПАДАБАЕЦЦА

Калінінградскія півавары звярнуліся ў адміністрацыю вобласці з просьбай абмежаваць імпарт піва з Беларусі.

Буйнейшы мясцовы вытворца хмельнага напою — сумеснае расійска-германскае прадпрыемства «Остмарк» — вымушаны быў знізіць адпускныя цэны на сваю прадукцыю на 25 працэнтаў. І, тым не менш, як сцвярджаюць прадстаўнікі калінінградскіх гандлёвых фірмаў, попыт на «Остмарк» у магазінах горада паяўляецца толькі пасля таго, як бывае прададзена апошняя бутэлька больш таннага, але не менш якаснага беларускага піва. Ураўняць канкурэнтаў змогуць толькі высокія ўвазныя пошліны. Аднак да гэтага справа яшчэ не дайшла.

Уладзіслаў ПЛАТУН, БЕЛТА.

У СВЕЦЕ

ПЕЛЕНГ-НАВІНЫ

ПРОЦІСТАЯННЕ ПРАЦЯГНЕЦЦА

У Грозным працягваецца мітынг апазіцыйных сіл. Патрабаванні ўдзельнікаў гэтай акцыі пратэсту застаюцца ранейшымі: вывад федэральных войскаў з тэрыторыі Чачні і адстаўка ўрада Заўгаева. На працягу ночы з аўторка на сераду на плошчы перад былым прэзідэнцкім палацам знаходзілася каля 500 чалавек. Чакаецца, што мітынг будзе працягвацца.

ГРАЧОЎ ІНСПЕКТУЕ РАСІЙСКІХ МІРАТВОРЦАЎ У БОСНІІ

Учора ў другой палове дня пасля пасяджэння Савета бяспекі Расіі міністр абароны Павел Грачоў вылецеў з трохдзённым візітам на Балканы. Сёння Грачоў азнаёміцца з ходам аперацыі шматнацыянальных сіл па выкананні пагаднення аб міры ў Босніі. Ён правядзе інспекцыю расійскай міратворчай брыгады дэсантнікаў, сустрэнецца з Вярхоўным Галоўнакамандуючым аб'яднанымі ўзброенымі сіламі НАТО ў Еўропе Джорджам Джоўэлем.

НА БАЛКАНАХ НАСПЕЎ СУР'ЁЗНЫ КРЫЗІС

У Босніі арыштаваны сербы, якіх падазраюць у ваенных злачынствах. Сярод іх генерал і яшчэ сем чалавек. Баснійскія сербы спынілі кантакты з урадам Босніі пасля арышту двух сербскіх афіцэраў. Урад Босніі паведамляе, што падазраваемыя будуць перададзены міжнароднаму ваеннаму трыбуналу. Інцыдэнт ператварыўся ў самы сур'ёзны крызіс з моманту падпісання Дэйтанскіх пагадненняў.

СЯРОД РАСІЙСКІХ ШПІЁНАЎ У ЧЭХІІ — 56 ДЫПЛАМАТАЎ

Чэшская прэса паведаміла, што 400 тайных агентаў Расіі аднавілі дзейнасць у Чэхіі. Выданні спасылаюцца на сакрэтны даклад, падрыхтаваны для ўрада, у якім гаворыцца, што агенты намагаюцца паўплываць на грамадскую думку і пазіцыю ўрада ў адносінах уступлення краіны ў НАТО і Еўрапейскі саюз. Згодна з паведамленнем, 56 агентаў з'яўляюцца расійскімі дыпламатамі.

ЗША ЗАБЯСПЕЧВАЛІ ПЛУТОНІЕМ 39 КРАІН

З рассакрэчаных у аўторак дакументаў вынікае, што Злучаныя Штаты за апошнія паўвека пастаўлялі плутоній 39 краінам. Сярод іх, як паведамляюць з Вашынгтона і Нью-Йорка, Ізраіль, Паўднёвая Афрыка, Іран і Ірак. Самыя буйныя пастаўкі рабіліся еўрапейскім саюзнікам Амерыкі: Вялікабрытаніі, Францыі, Бельгіі і былой Заходняй Германіі. Рассакрэчванне гэтых даных праводзіцца ў адпаведнасці з рашэннем прэзідэнта Клінтана прытрымлівацца палітыкі большай галоснасці пасля перыяду «халоднай вайны».

КІТАЙ ПЕРАДАЕ ЯДЗЕРНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ ПАКІСТАНУ

Урад ЗША выказаў заклапочанасць магчымай перадачай ядзерных тэхналогій з Кітая ў Пакістан. Аднак прадстаўнік амерыканскага дзярждэпартамента адмовіўся каменціраваць паведамленні газет аб тым, што амерыканская разведка атрымала новыя доказы таго, што ядзерныя тэхналогіі на самай справе пастаўляюцца ў Пакістан.

ДЗІЦЯЧАЯ СМЯРОТНАСЦЬ ЯК ФАКТАР РАСПАДУ ДЗЯРЖАВЫ

Амерыканскі часопіс «Ю.С. ньюс энд Уорлд рыпорт» надрукаваў даклад ЦРУ аб краінах з павышанай рызыкай дзяржаўнага распаду. Спіс такіх дзяржаў узначальваюць Пакістан, Індыя, Бангладэш і Турцыя. Асноўным індыкатарам нестабільнасці дзяржаў аўтары даклада лічаць высокі ўзровень дзіцячай смяротнасці. Да іншых краін з высокай ступенню рызыкі дзяржаўнага распаду адносяцца Арменія, Бенін, Балівія, Бразілія, Кіргізія, Мадагаскар, Замбія і некаторыя іншыя краіны.

ДАЧКА СТАЛІНА ПАСТРЫГЛАСЯ Ў МАНАШКІ

Агенцтва ІТАР—ТАСС распаўсюдзіла паведамленне са спасылкай на міланскі штотыднёвік «Кі» аб тым, што дачка Сталіна Святлана Алілуева пастрыглася ў манашкі і жыве ў адным з італьянскіх манастыроў.

Радыё «Свабода», «Голас Амерыкі», радыё «Рым» і «Радыё-РОКС» слухаў Сяргей ПРОТАС.

ІНФАРМ-КАКТЭЙЛЬ

Для адных марозная зіма — задавальненне, для другіх — зусім наадварот.

Пакуль у канадскай сталіцы Атаве наведвальнікі гарадскога парку глядзяць на ледзяныя скульптуры, іх суседзі прыходзяць у адчай ад хвалі халадоў, якая ахапіла паўкраіны і дакацілася да самых паўднёвых штатаў. Незвычайна нізкія тэмпературы, якія б'юць усе рэкорды халадоў у ЗША з 1886 года, ужо прывялі да смерці 80 чалавек. У Мінесоце зафіксавана тэмпература мінус 51 градус па Цэльсію.

Асашыэйтэд Прэс

Які самы вялікі сюрпрыз можа паднесці шлюбаразводны працэс? Брытанская Феміда ў поўным здзіўленні выявіла, што англічанка семнаццаці гадоў не ведала, што яе муж... таксама жанчына. Транссексуал, народжаны жанчынай і стаўшы мужчынам, быў пазбаўлены дзетароднага органа і ўсе гэтыя гады пад покрывам ночы карыстаўся яго пластмасавай копіяй. Вярхоўны суд Злучанага Каралеўства вызначыў: «Былая жанчына ўчыніла цяжкае злачынства, звязаўшы сябе шлюбнымі вузамі з прадстаўніцай слабага полу». Але не больш таго. Былым мужу і жонцы, мяркуючы па ўсім, прыйдзецца адправіцца ў Страсбург, каб там паўстаць перад Еўрапейскім судом па правах чалавека.

ІТАР-ТАСС

Драўляныя падшыпнікі пачалі вырабляць у рамонтнай майстэрні АТЗТ «Іжэўскі» (пас. Піжанка, Кіраўскай вобласці).

Дарагоўля запчастак падштурхнула вяцкіх майстроў стварыць навінку недарагую і надзейную. Яны паспрабавалі рабіць падшыпнікі для камбінаваных сельгасагрэгатаў з дрэва. Вытачылі дэталі з высушанага бярозавага бруса і выварылі іх у адпрацаваным машынным масле, пасля чаго паставілі туды, куды трэба. Эксперыменты паказалі надзейнасць і даўгавечнасць навінкі.

ЕАН.

І НА КОШТ ТЭАТРАЛЬНЫХ БІЛЕТАЎ РАСПАЎСЮДЖВАЮЦЦА ЛЬГОТЫ

Праўда, толькі для навучэнцаў музычнага вучылішча. І толькі ў оперным тэатры. Кошт ільготнага білета роўны 5000 рублёў. Затое месца ў партэры каштуе 30 і 35 тысяч рублёў. Звычайныя білеты аматары оперы змогуць набыць за 10, 15 альбо 25 тысяч рублёў.

У Купалаўскім тэатры за месца ў партэры давядзецца выкладзіць 12.000 рублёў. А самыя танныя білеты каштуюць 3000 рублёў. Гэтак жа і ў астатніх мінскіх тэатрах. Праўда, самы дарагі білет вам прададуць за 10.000. На большыя траты падштурхне хіба што жаданне наведаць Альтэрнатыўны тэатр. Білеты на яго пастаноўкі ў студзені каштавалі 15—20 тысяч рублёў. На лютаўскія спектаклі ў Альтэрнатыўным білеты давядзецца купляць ужо за 25 тысяч рублёў.

І ўсё ж, калі тэатр, як вам падаецца, вымагае значных расходаў, заўважу: тэатралы, у адрозненне ад кінагледачоў, знаходзяцца ў больш выгадным становішчы. У кінатэатрах альтэрнатывы няма: білеты там каштуюць 7 альбо 12 тысяч рублёў (у залежнасці ад узроўню фільма). За дыскатэку ў кінатэатры кожнаму наведвальніку даводзіцца выкладваць 15.000 рублёў. Сёння цяжка меркаваць, многа гэта ці мала. Як і цяжка раіць тэатралу выбіраць спектакль у залежнасці ад кошту білета. Адзінае, што варта, відаць, заўважыць: доўга і такія цэны на тэатральныя білеты не пратрымаюцца. Калі за 1 паездку ў гарадскім транспарце вы плаціце 1500 рублёў, то ў такім супастаўленні 3000 (няхай сабе і як самы танны кошт) за спектакль здаюцца смешнай лічбай.

Алесь КАРЛЮКЕВІЧ.

ТЭАТР ПАЧАКАЕ. ЯК ЗАЎЖДЫ, ДА ЛЕПШЫХ ЧАСОЎ

Спынена і без таго зацягнутая на доўгія гады рэканструкцыя аднаго са старэйшых будынкаў Магілёва — абласнога драматычнага тэатра. Прычына для цяперашніх часоў звычайная: няма грошай.

Паколькі будынак Магілёўскага драмтэатра ўяўляе гістарычную, архітэктурную і культурную каштоўнасць, яго абнаўленне павінна фінансавацца з рэспубліканскага бюджэту. Але вось бяда: з яго на бягучы год на ўсе культурныя ўстановы Магілёўшчыны плануецца выдаткаваць каля 20 мільярдаў рублёў. Гэта прыкладна ўтрая менш, чым патрабуецца толькі для заканчэння работ па рэканструкцыі тэатра. Няма сродкаў на працяг будоўлі і ў бюджэце вобласці. Таму магілёўскім тэатралам зноў прыйдзецца пачакаць. Адказу на пытанне, як доўга, пакуль не ведае ніхто.

Сяргей ГРЫБ.

ПАРАШУТЫСТАМ ДАПАМАГАЕ «РЫТМ»

Навейшая тэхніка ў наш час вырашае многае, калі не ўсё. У правільнасці гэтага сцвярджэння ў чарговы раз пераканаліся на ўласным вопыце беларускія спартсмены. Яшчэ мінулай восенню наша рэспубліка пасылала на І Сусветныя спартыўныя гульні ваеннаслужачых моцную каманду. На жаль, парашутысты, якія са сваёй экіпіроўкай выглядалі на фоне іншых удзельнікаў дапатопнымі, адкінулі нашых спартсменаў далёка ад прызавых месцаў.

Даведаўшыся аб гэтым, кіраўнік фірмы «Рытм» Мечыслаў Віткоўскі вырашыў зрабіць ваенным спартсменам прыемны падарунак. Нядаўна ён пабываў у брыгадзе спецназа ў Мар'інай Горцы, дзе ва ўрачыстай абстаноўцы ўручыў спартыўнай камандзе часці пяць сучасных парашутаў. У планах фірмы — забяспечыць усю спартыўную каманду брыгады формай, парашутамі і неабходнай экіпіроўкай. У ваенных ёсць важкія падставы спадзявацца на дапамогу «Рытма». Нядаўна ў мінскі офіс гэтага мнагапрофільнага вытворча-камерцыйнага прадпрыемства прыйшла вестка аб прысуджэнні яго кіраўніцтву ганаровай міжнароднай узнагароды «Факел Бірмінгама» — за паспяховае эканамічнае выжыванне і развіццё ў цяжкіх эканамічных умовах.

Аляксандр УЛАДЗІМІРАЎ.

Сардэчна віншуем з днём нараджэння АНТОНАВУ Ірыну Мікалаеўну.

Жадаем кветкай увісці ўсё жыццё. Хай збудуцца ўсе твае мары і спадзяванні, а таксама надзеі бацькоў.

Вялікая твая радня.

36,6°

Ракетныя тэхналогіі могуць прапанаваць сродак барацьбы з ракам грудзей

Работнікі аховы здароўя ЗША ўступілі ва унікальнае партнёрства з Цэнтральным разведвальным упраўленнем з мэтай прымянення тэхналогій атрымання адлюстравання, што выкарыстоўваюцца для выяўлення і навядзення ракет, для ранняга выяўлення рака грудзей.

«Я лічу, што калі ў нас ёсць тэхналогіі, якія дазваляюць бачыць ракеты, што знаходзяцца ў небе на адлегласці 24 тыс. км, то нам трэба авалодаць гэтай тэхналогіяй для выяўлення і маленькіх пухлін у жаночых грудзях», — сказала 31 студзеня д-р Блументал, дырэктар упраўлення здароўя жанчын у Міністэрстве аховы здароўя і сацыяльных службаў ЗША.

Блументал сказала, што гэта ваенная разведвальная тэхналогія не хутка зможа выкарыстоўвацца ў медыцыне, беручы пад увагу велізарны маштаб распаўсюджвання рака грудзей ва ўсім свеце. Толькі ў Злучаных Штатах у 1993 г. было выяўлена 182 тысячы новых выпадкаў захворвання на рак грудзей, і 46 тысяч жанчын памерлі ад гэтай хваробы.

У перыяд з 1973 па 1991 г. захворванне на рак грудзей у Злучаных Штатах вырасла на 24 працэнты. Усяго два дзесяцігоддзі назад толькі кожная дваццатая жанчына станавілася ахвярай гэтага захворвання. Цяпер на яго хварэе кожная восьмая жанчына.

На думку Блументал, нягледзячы на тое, што запатрабуюцца гады выпрабаванняў, тэхналогіі атрымання адлюстравання для навядзення ракет і апазнавання цэлі могуць аказацца намнога больш надзейнымі, чым мамаграфічныя метады, якія выкарыстоўваюцца ў апошнія 40 гадоў.

Мамаграфія з'яўляецца тэхнікай атрымання адлюстравання пры дапамозе рэнтгена і з'яўляецца сёння найбольш эфектыўнай тэхнікай выяўлення ракавых пухлін на ранніх стадыях, калі яны найбольш паддаюцца лячэнню. Лічыцца, што выкарыстанне звычайных мамаграфічных сродкаў здольна скараціць смяротнасць жанчын старэй за 50 гадоў ад рака грудзей на 30 працэнтаў.

Аднак, на думку Блументал, у 10—15 працэнтаў выпадкаў мамаграфія аказваецца няздольнай выявіць рэальнае ракавае паталагічнае змяненне, а ў 40 працэнтах выпадкаў дае «фальшывы станоўчы» вынік, указваючы на наяўнасць ракавай пухліны, якой на самай справе няма. Не адпаведныя рэчаіснасці вынікі вядуць да непатрэбных і дарагіх медыцынскіх працэдур, у тым ліку да хірургічнай біяпсіі.

Джым ФУЛЕР, ЮСІА.

РЭПАРЦЁР АТРЫМАЎ ЗАДАННЕ...

наведаць рынак у глыбінцы

Рэчыца — буйны раённы цэнтр. Там знаходзіцца шмат прамысловых прадпрыемстваў і пражывае амаль 100 тысяч чалавек, калі ўключаць бліжэйшыя пасёлкі. Зразумела, што гандаль там развіты, па-першае, таму што вытворцаў харчовай прадукцыі ў раёне хапае, па-другое, што на многіх прадпрыемствах складанае становішча і іх працаўнікі падаліся ў гандляры.

Мясцовыя «Камароўка» і «Дынама» раздзяляе толькі праезная частка. [illegible] тавары пераважна мінулага і пазамінулага сезона.

Напрыклад, мужчынскі кажух, які ў сталіцы носіць бадай кожны трэці, у Рэчыцы не прапануе ніводны гандляр. Мода «ад Дынама» да правінцыі даходзіць не адразу.

Пра імпартныя далікатэсы гаварыць наогул не прыходзіцца. Але мясцовыя вытворцы прапануюць іншы раз такія прадукты, што любы замежны грамадзянін пазайздросціць. Самаробныя сыры, тварог, агуркі... А сала, паляндвіца! Пальчыкі абліжаш. Зразумела, далікатэсы каштуюць нямала. Цэны на натуральныя прадукты (мяса, бульба і г. д.) амаль такія ж, як у Мінску.

Свініну рэчыцкія гандляры прапануюць па 30 тысяч рублёў за кілаграм, ялавічыну — па 25 тысяч. Кілаграм мёду «пацягне» на 35 тысяч рублёў, цыбулі — 5, бульбы — 2,2 тысячы. Дзякуючы гандлярам з Украіны, якія вязуць сала, арэхі, алей, апошні каштуе ўсяго 16—18 тысяч за 1 літр (у Мінску не менш 20 тысяч рублёў). Цукар там таксама недарагі — 8 тысяч рублёў за кілаграм. Рэчыцкім жыхарам пашанцавала яшчэ ў адным: гандляры з Расіі прапануюць курскія шакаладныя цукеркі па даступных цэнах — ад 50 тысяч рублёў за кілаграм. Самыя дарагія — «Чырвоная шапачка» — каштуюць 70 тысяч, тады як цана на беларускія «Шапачкі» — звыш 80 тысяч рублёў.

Паліна КРЫЛОВА.

КРЫМІНАЛ, ЗДАРЭННІ

ВАРТАВЫ ВЫПІЎ І...ЗГАРЭЎ

За інфармацыяй, атрыманай у Галоўным упраўленні ваенізаванай пажарнай службы МУС РБ, за студзень у краіне здарылася 1563 пажары, [illegible]

[illegible] плітку. Загарэлася адзенне, якое і стала прычынай трагедыі.

Усяго за першы месяц новага года агонь забраў жыцці 146 чалавек, у тым ліку адзінаццаці дзяцей.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ЭХ, ГАРОТНЫЯ

Каля дзвюх тысяч чалавек, якія рэгулярна ўжываюць наркотыкі, афіцыйна зарэгістравана ў Беларусі.

Для параўнання: гадоў сем назад на ўліку ў Мінскім наркалагічным дыспансеры знаходзілася не больш сарака чалавек. На думку спецыялістаў, рэальная колькасць наркаманаў значна перавышае афіцыйныя даныя.

Лячыць гэтую страшную хваробу даволі цяжка. І справа не толькі ў фізічнай залежнасці арганізма ад наркотыку. У рэспубліканскіх лячэбных установах не хапае лякарстваў, якімі можна эфектыўна лячыць пацыентаў. Востра адчуваецца недахоп грашовых сродкаў на іх набыццё. Вывядзенне ж наркамана са стану «ломкі» абыходзіцца дзяржаве ў сотні тысяч рублёў.

Аляксандр МАКАРАЎ.

ГРОШАЙ НЕ ЗДАБЫЛІ, ЗАТОЕ «ПРАГРЫМЕЛІ»

Гэтымі днямі работнікам аддзела міліцыі г.п. Смілавічы Чэрвеньскага раёна прыезджыя «гастралёры» з Мінска дабавілі клопатаў.

Як паведаміў начальнік Чэрвеньскага РАУС Міхаіл Вядзерка, пяцёра рэкеціраў вырашылі падзарабіць, запатрабаваўшы ў свайго даўняга знаёмага, непрацуючага жыхара пасёлка, які раней пераганяў легкавыя аўтамабілі з-за мяжы, суму ў 1200 долараў ЗША. З прычыны адмовы «ўпартага сябра» яны пагражалі яго дзіцяці. Па меры зацягвання тэрмінаў разліку апетыт гасцей рос, і называліся ўжо крыху іншыя сумы.

У выніку ж пацярпеўшым аказаўся сябар «заложніка», у якога апошні паспрабаваў схавацца. Яму былі нанесены цяжкія цялесныя пашкоджанні. Акрамя таго, сталічныя госці «ўзарвалі» на вуліцы выбуховае ўстройства, тып якога ўстановіць экспертыза.

Пасля сігналу, які паступіў у РАУС, усе пяцёра аматараў лёгкай нажывы былі затрыманы на тэрыторыі гарпасёлка. Па гэтаму факту ўзбуджана крымінальная справа.

Надзея НІКАЛАЕВА.

З АКНА Ў СУСЕДНІ ДОМ ШЛЯХ КАРАЦЕЙШЫ

Перад вачамі двух віцяблян, што па марозе спяшаліся ў бліжэйшы магазін, паўстала нечаканая карціна: на трэцім паверсе ў доме № 23 па вуліцы Ленінградскай расчынілася акно і адтуль паляцелі адзенне, падушка, коўдра... Затым у праёме паказалася бабулька з яўным намерам адправіцца ўслед за рэчамі.

Мужчыны адрэагавалі імгненна: падхапілі коўдру і расцягнулі яе пад акном. 86-гадовая бабулька, якая выскачыла з акна, добра прызямлілася на коўдру, не атрымаўшы ні драпіны.

Брыгадзе «хуткай дапамогі» бабулька растлумачыла, што ёй спатрэбілася схадзіць у суседні дом насупраць, праз вуліцу...

Аб гэтым здарэнні расказала гарадская газета «Витьбичи».

Вольга СІДАРОВІЧ, БЕЛТА.

ЮНАЯ ТЭРАРЫСТКА

Яшчэ адзін акт тэлефоннага тэрарызму адзначаны ў Магілёве. Пакупнікоў міліцыя вымушана была на дзве гадзіны выдаліць з Цэнтральнага універмага, а заняткі ў 38-й школе былі закончаны раней, чым звычайна.

Як і ў папярэдніх выпадках, бомбы не знайшлі. Цікава, што на гэты раз «жартавала»... дзяўчынка, вучаніца трэцяга класа.

Васіль ЛЕЎЧАНКА.

СЁННЯ

СОНЦА

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск –	7.44	17.03	9.19
Віцебск –	7.38	16.49	9.11
Магілёў –	7.33	16.53	9.20
Гомель –	7.26	16.55	9.29
Гродна –	7.58	17.19	9.21
Брэст –	7.54	17.25	9.31

МЕСЯЦ

Поўня
4 лютага

ІМЯНІНЫ

Пр. Ксенафонта, Марыі, Аркадзія і Іаана, Сімяона, Фёдара, Іосіфа

К. Гераніма, Себасцяна

НАДВОР'Е

Сёння ўдзень па рэспубліцы захаваецца марознае, без ападкаў надвор'е. Тэмпература паветра ў Гродне і Брэсце — 10—12, Мінску — 11—13, Гомелі — 13—15, Магілёве і Віцебску — 14—16 градусаў марозу.

У наступныя двое сутак надвор'е застанецца такім жа халодным. Тэмпература ўначы — 20—25, месцамі да 28—30, удзень — 9—14 градусаў ніжэй нуля.

Медыцынскі прагноз надвор'я на 8-9 лютага

У бліжэйшыя двое сутак надвор'е будзе вызначацца праходжаннем антыцыклону, што прывядзе да далейшага паніжэння тэмпературы і росту ўтрымання кіслароду ў паветры. Захаваецца спастычны тып надвор'я. **8 лютага — неспрыяльны дзень па геафізічных фактарах**. У такіх умовах магчыма пагаршэнне самаадчування ў метэазалежных хворых з захворваннямі сардэчна-сасудзістай і дыхальнай сістэм, страўнікава-кішачнага тракта.

У мэтах прафілактыкі рэкамендуецца пазбягаць фізічных і псіхаэмацыянальных нагрузак, захоўваць дыету з пераважным ужываннем раслінай ежы, прымаць полівітаміны, якія ўтрымліваюць у сваім саставе вітамін «Е», заспакаяльныя і сасударасшыральныя лекавыя прэпараты.

Антаніна КАРОЗА, навуковы супрацоўнік БелНДІ кардыялогіі.

АДКУЛЬ І КУДЫ ВЯДУЦЬ ДАРОГІ?

Адкрываючы свету Беларусь, Мележ адкрываў яе і самім беларусам

ІВАН МЕЛЕЖ, якому сёння споўнілася б 75 гадоў, сваю знакамітую «Палескую хроніку» меркаваў назваць «Куды вядуць дарогі». Гэта, вядома, не назва, а хутчэй напрамак, у якім ішлі думкі пісьменніка. Але ў час, калі ён жыў і тварыў, адказ на гэта пытанне быў загадзя вядомы. На чырвоных палотнішчах плакатаў, на дахах заводаў і ўстаноў, у партыйных песнях-араторыях значылася: «Усе дарогі вядуць да камунізму!» Сама пастаноўка пытання была кашчуннай праявай вальнадумства і падазронай творчай самастойнасці. Такога нікому не даравалі.

Нядаўна Янка Брыль узгадаў адну з «чыстак» (акцыя, якая дасталася брэжнеўскаму рэжыму ў спадчыну ад 30-х гадоў), што наладзілі Мележу і яго раману «Людзі на балоце», першай частцы хронікі, «вертухаі» ад кіраўніцтва Саюза пісьменнікаў. Сам Іван Паўлавіч сядзеў з краю доўгага рада і, падтуліўшы, як падбітае птушаня, параненае правае плячо, цярпліва слухаў відавочную лухту. Яго ўпікалі за тое, што паставіў у цэнтр сюжэта не чалавека з чырвонай кніжкай у кішэні, а беспартыйную прыгажуню Ганну Чарнушку і анархічна настроенага Васіля Дзятла. Упікалі ў недастатковым прафесіяналізме, а па сутнасці ў нелаяльнасці да савецкай улады. Заступіўся Алесь Адамовіч. Прыняўшы «правілы гульні», гаварыў аб прафесіяналізме: «Мележ сам знайшоў глінішча, сам накапаў гліну, сам зрабіў з яе цэглу, сам пабудаваў прыгожы будынак». Выступоўца абыграў у гэтым параўнанні назву вёскі, дзе нарадзіўся Мележ, — Глінішча. Але меў ён на ўвазе і акт стварэння свету — з гліны Бог вылепіў чалавека. Ствараючы сваю мастацкую мадэль свету, сваіх герояў, Іван Мележ таксама быў дэміургам. Але цікавы ён не толькі як дойлід і маляр, але і як мысліцель, самабытны філосаф «беларускага шляху».

У пісьменніка быў свой «план» мастацкага свету, які адлюстроўваў яго бачанне жыцця. На жаль, гэты план І. Мележ не паспеў здзейсніць. Многае даводзіцца дабудоўваць нам, яго чытачам, даследчыкам. Занятак не толькі цікавы, але і карысны: пісьменнік глыбока думаў пра многае з таго, што актуальна ва ўсе часы, а сёння, калі цяжкія пытанні грувасцяцца адно на адно, — асабліва.

ЯК І ЎСЯКІ МАСТАК СЛОВА, Мележ мысліў вобразамі, малюнкамі. Але менавіта мысліў. У яго была магутная інтуіцыя, яго раманы поўняцца згадкамі і здагадкамі, прадказаннямі. Часам геніяльнымі. На пытанне: «Куды вядуць дарогі?» — ён даў дакладны адказ. Нікуды! Усе дарогі, абраныя бальшавіцкім кіраўніцтвам у 20—30-я гады, вядуць да прорвы. Чым далей разгортваюцца падзеі ў «Палескай хроніцы», тым мацней выяўляе сябе абсурд як галоўны закон існавання таталітарных сістэм. У лёсе мележаўскіх герояў імкненне да энтрапіі выяўляецца літаральна ва ўсім: гіне, топчацца на вачах у чытача каханне Васіля і Ганны, адзначаных Божай ласкай герояў, руйнуюцца сем'і, цэлыя сялянскія роды, разбураецца пасвойму гарманічны свет беларускай вёскі Курані.

У накідах магчымага фіналу ёсць сцэна вяртання Васіля Дзятла з вайны ў родныя Курані. Ён стаіць на папялішчы: ад мінулага жыцця, дзе было столькі ўсяго, добрага і кепскага, радаснага і сумнага, не засталося нічога і нікога. А жыццё, сучасная гісторыя беларусаў, якой не меў магчымасці пабачыць Мележ, паставіла сваю кропку. Родная вёска пісьменніка Глінішча, правобраз Куранёў, трапіла ў чарнобыльскую зону і жыве-дажывае свой век па-за ўсякімі часам і прасторай. Метафарызм мыслення быў блізкі Мележу, а сімволіка гэтага факта жахлівая і не пакідае ніякай надзеі на будучыню.

Тым не менш, чалавек, як істота мэтанакіраваная, жыве будучыняй. Нават калі наперадзе яго чакае чарговы міраж, за які яму і яго дзецям давядзецца вельмі дорага заплаціць. Але ўсё, што ён мае, знаходзіцца ў мінулым. І. Мележ гэта вельмі добра разумеў. Як і тое, што мінулае не можа быць мэтай. Каштоўнасць успамінаў пра пеажытае чалавекам і народам, вядома, у тых уроках, якія мы ніяк не можам засвоіць, як школьнікі, што, вырваўшыся на волю, адразу забываюць усю навуку. У блізкім і далёкім мінулым Мележ бачыў грунт, аснову, фундамент, падведзеныя нашымі папярэднікамі пад устоі цывілізацыі. Ён быў адным з тых, хто пачынаў распрацоўваць ідэю беларускага фундаменталізму, хоць і не паспеў дакладна сфармуляваць само гэта паняцце. **Думка аб тым, што дом, у якім жыць не аднаму пакаленню беларусаў, трэба будаваць на трывалай глебе лепшых народных традыцый, была мележаўскай думкай**. І яе пісьменнік настойліва, паслядоўна, упарта праводзіў і ў сваіх творах, і ў сваёй грамадскай дзейнасці. У гэтым ён быў не толькі традыцыяналістам, але і кансерватарам у пазітыўным значэнні гэтага слова. Наватараў, аматараў будаваць, ставіць у хуткім тэмпе «пацёмкінскія вёскі» заўсёды хапала. У часы, калі пачынаў І. Мележ, такімі заўзятымі аматарамі апяваць шчаслівую будучыню і быць «на грэбені сучаснасці» была не большасць членаў Саюза пісьменнікаў.

САМ І. МЕЛЕЖ неяк узгадваў першыя гады пасля вайны з фашызмам, калі ён задумаў эпічны твор па гарачых слядах падзей. Літаратурная крытыка з падачы ідэалагічнага начальства тады накінулася на яго і яго калег з папрокамі ў адставанні ад імклівай сучаснасці. Людзі яшчэ жылі ў зямлянках, а некаторыя няўрымслівыя апекуны літаратуры даводзілі, што вайна адышла ў мінулае і ваенная тэматыка стала гістарычнай, неласкава прынятай уладамі тэматыкай. Тое ж самае паўтарылася і пазней, калі Мележ апублікаваў першыя часткі «Палескай хронікі», дзе адступіўся яшчэ далей у мінулае, у гады калектывізацыі: там ён знаходзіў «разгадкі нашых крыўдаў і бед», бо менавіта ў гады «вялікага пералому» пачалося апусканне «сялянскай Атлантыды» на дно гістарычнага забыцця. Але пісьменнік ужо быў непахісным, як само наканаванне. **Адкрываючы свету Беларусь, ён адкрываў яе і самім беларусам**. Прынамсі, У. Караткевічу з яго адважным рэйдам у далёкае мінулае было ўжо хоць крыху лягчэй, маючы ў літаратуры такі прэцэдэнт.

«Палеская хроніка» — гэта эпічнае апавяданне пра людзей у Вялікай Гісторыі. Але якіх? Людзей на балоце! Тых самых, пра якіх кажа прымаўка: «Ногі ў балоце, а галава ў аблоках». Такога ў сусветнай літаратуры яшчэ не здаралася. Былі людзі на Барадзінскім полі, пад Ватэрлоа, на Ціхім Доне. Праўда, былі і на Палессі. Але бачылі іх (І. Тургенеў, А. Купрын, Я. Колас) староннім паглядам, выхопліваючы з натоўпу палешукоў каларытныя постаці, з усяго багацця мясцовай міфалогіі — асобныя яркія фрагменты. І. Мележ, маючы на ўзбраенні толькі наіўна-прастадушны, закаханы ў Палессе пагляд, убачыў тое, чаго ніхто не заўважаў. Ён паглядзеў на беларускае Палессе не як на ўскраіну ці рэгіён, а як на цэнтр сусветнай цывілізацыі. «Мора Герадота», «галоўнае балота Еўропы», на берагах якога селяцца іншыя народы і дзяржавы, адчуваючы яго магутнае прыцягненне, — так усвядоміў свой родны край І. Мележ. Калі людзі жывуць на балоце, сярод балота на працягу многіх пакаленняў, то яны і свет, і само балота, мабыць, успрымаюць як своеасаблівы сімвал чалавечага існавання наогул, такога хісткага, няпэўнага, зменлівага, як слынная «зона» ў «Сталкеры» Андрэя Таркоўскага. Але ж людзі жывуць, стварыўшы цэлую сістэму паводзінаў і рэакцый на знешнія раздражняльнікі, стаўшы сапраўднымі «балацянамі». Дарэчы, І. Мележ тут нечакана пераклікаецца з М. Гарэцкім, які мысліў у тым жа напрамку, называючы беларусаў у сваім дзённіку «балацянамі», іх мову і літаратуру — «балотмовай», «баллітаратурай».

ВОСЬ ЁН, «ФУНДАМЕНТ», на якім трымаецца беларушчына! Балота! Багна! Тое, што ў нармальных людзей называецца «застоем», для беларусаў і ёсць само жыццё. І яны жывуць, і выжывуць. Бо валодаюць унікальным вопытам існавання ва ўмовах, якіх астатняе чалавецтва ўнікае, старонніцца, аддаючы перавагу чамусьці больш пэўнаму і ўстойліваму. Можа, адсюль гэта ўздзначанае Мележам пераканане яго герояў-палешукоў, што «яны вышэй за іншых». Што «ў іх і «законы» і парадкі лепшыя, і яны самі — разумнейшыя». «Дзе-дзе, а ў іх старане, дык аж лішне гэтага непахіснага пераканання ў сваёй дасканаласці». Пад учынкамі, паводзінамі беларусаў-палешукоў надзейная глеба іх гісторыі. Вось адкуль у тэксце мележаўскіх раманаў частыя словы «вякі», «як заўсёды», «як тысячы год назад». І нават: «Як і сто тысяч год таму». «Мінулае, — піша аўтар, — ішло заўсёды побач. Яно то мацнела, то слабела, але не знікала ўсё: на ўсім быў яго цень. Яно прыходзіла ноччу, ішло ўдзень, было ў думках, у настроі, ва ўчынках».

СУЧАСНАЯ НАВУКА шмат разважае пра «дыскурсы», «парадыгмы», «даследчыя праграмы». Так яна выяўляе сваё разуменне свету: жыць — азначае рэалізоўваць мінулы вопыт у новых умовах, уключаць стары матэрыял у новыя схемы, ураўнаважваць сучаснае мінулым. Помніць — значыць ісці наперад. Добра ўсведамляючы гэта, беларуская мастацкая і навуковая інтэлігенцыя зрабіла ўсё, каб зафіксаваць, сабраць духоўныя здабыткі народа. І. Мележ у гэтым працэсе займае асаблівае месца. Наша задача — асэнсаваць накопленае, ажыццявіць незавершанае. Калі мы гэта зможам, то нашы сны пра «залаты век» стануць явай.

Міхась ТЫЧЫНА,
пісьменнік, кандыдат філалагічных навук.

РЭШТА

- *«ХАГІ-ТРАГЕР»*
- *«ГЕРКУЛЕС ВЯРТАЕЦЦА»*
- *«ЭЛЕКТРАШОК»*
- *«УКРАСЦІ І ЎЦЯЧЫ, АЛЬБО СВОЕЧАСОВА ЗМЫЦЦА-2»*

ФІЛЬМАТЭКА

Новая мастацкая кінастужка «ХАГІ-ТРАГЕР» створана сумесна кінамайстрамі Расіі і ЗША.

Гэта крымінальная вострасюжэтная гісторыя, знятая, да таго ж, у жанры баевіка з элементамі містыкі, не можа не прыцягнуць увагі гледачоў і пракатчыкаў. Ды і імя рэжысёра Эльдара Уразбаева многае гаворыць людзям, якія ведаюць кіно. Гэта ім зняты такія відовішчныя стужкі, як «Транссібірскі экспрэс», «Візіт да Мінатаўра», «Інспектар ДАІ», «Глядзі ва ўсе вочы». У сваёй новай карціне Уразбаеў пайшоў далей і паспрабаваў сябе ў крыху іншым жанры — фільме жахаў у рускім варыянце.

Мяркуйце самі: на нашых экранах яшчэ не дзейнічалі лялькі-зомбі, запраграміраваныя на фізічнае знішчэнне людзей. Лялькі твораць свае страшныя справы ў гушчы нашага сучаснага жыцця на вуліцах Масквы. На жаль, зводкі МУС стракацяць аб прапаўшых без вестак людзях і хочаш ці не — паверыш у жахлівае паляванне незямных сіл...

Сцэнарый фільма напісаў Уладзімір Брагін. Галоўныя ролі выконваюць Георгій Віцын, Аляксандр Пяскоў, Сяргей Шакураў, Людміла Чурсіна.

Кінематаграфісты Аўстраліі перадаюць на суд гледачоў мастацкую кінастужку «ГЕРКУЛЕС ВЯРТАЕЦЦА». Аўтар сцэнарыя — Дэа Мангана, рэжысёр — Давід Паркер.

Прыемна даведацца, што энтузіясты-бясрэбранікі, на якіх трымаецца ўся клапотная кінапракатная гаспадарка, ёсць і на далёкім аўстралійскім кантыненце. У іх ліку Брэд Макбейн, які вырашыў арганізаваць у родным горадзе кінаабслугоўванне на прынцыпова новай аснове. «Навізна», як ні дзіўна, заключалася ў рашучым вяртанні да старога — няхай усё будзе так, як «у старыя, добрыя часы», няхай глядач адчувае сябе ў кіназале ўтульна, няхай глядзіць фільмы 20—30-гадовай даўнасці, калі кіно яшчэ не ведала ні «крутой» эротыкі, ні жорсткасці, ні наватарскіх рэжысёрскіх выкрутасаў! Макбейн не пабаяўся ўступіць у канфлікт з самім містэрам Кентам! А містэр Кент быў кіраўніком мясцовай кінакарпарацыі і пакляўся сцерці з зямлі канкурэнта, які рызыкнуў адкрыць свой цнатлівы тэатрык каля яго бліскучага кінапалаца...

У галоўных ролях заняты Дэйвід Аг'ю, Майкл Кармен, Мэры Кастас, Брус Спенс, Брэндан Сур.

Будзе паказвацца ў кінатэатрах і амерыканская мастацкая кінастужка «ЭЛЕКТРАШОК». Яе пастаноўку па свайму сцэнарыю ажыццявіў рэжысёр Уэс Крэйвен.

Знакамітым яго зрабіў фільм «Кашмар на вуліцы Вязаў». Крэйвен застаўся верны жанру містыка-фантастычнага трылера і адну за адной выдаваў стужкі, разлічаныя на гледачоў з моцнымі нервамі.

І сапраўды, гэта трэба ж прыдумаць такое параджэнне пекла, якое нават электракрэсла не бярэ! Смяротны для іншых шматвольтавы ўдар маньяку і забойцу Хорасу Пінклеру надаў новыя якасці, ды такія, што перад ім аказалася бяссільнай уся паліцыя ціхага гарадка Мэрывіля, дзе разыграліся гэтыя падзеі.

Паліцыя нічога не магла зрабіць са Знішчальнікам Сем'яў, як ахрысцілі Пінкера газеты, і пры яго рэальным жыцці. Будучы для ўсіх простым тэлевізійным майстрам, ён беспакарана тварыў свае жахлівыя справы. Але ў паядынак з ім уступіў студэнт Джанатан Паркер, чые блізкія таксама сталі ахвярамі забойцы. Пінкер з'яўляўся Джанатану ў яго снах і той наяве змог высачыць і перадаць у рукі паліцыі няўлоўнага тэлевізіёншчыка. А калі Пінкер набыў здольнасць усяляцца ў іншых людзей, Джанатан змог разгадаць яго сакрэты...

Цікава праводзяць свае ролі ў фільме Майкл Мерфі, Пітэр Берг, Кэмі Купер, Мітч Пілеці.

У ЗША знята і мастацкая стужка «УКРАСЦІ І ЎЦЯЧЫ, АЛЬБО СВОЕЧАСОВА ЗМЫЦЦА-2». Аўтар сцэнарыя — Марк Севі, рэжысёр — Олі Сесон.

Той, хто ўжо бачыў фільм з такой назвай, павінен помніць, што гэтыя словы — своеасаблівы дэвіз бацькі і сына Потэраў, якія па-заліхвацку, артыстычна рабавалі банкі ў маленькіх гарадках ЗША. Магчыма, не забыты і 16-гадовы Нельсан Потэр, яго нястомная фантазія ў распрацоўцы арыгінальных планаў рабавання, уменне віртуозна пралічваць усе варыянты «апазіцыі».

Прайшлі чатыры гады (між першым фільмам і другім). Старэйшы Потэр, на жаль, сядзіць у турме, а малодшы займаецца справамі зусім іншымі. Свой багаты вопыт Нельсан выкарыстоўвае, працуючы ў страхавой кампаніі, якая забяспечвае ахову банкаў. Але як ён гэта робіць? Зноў рабуе банкі, прычым па заданню фірмы. Разам з ім эксперт — выпускніца факультэта правазнаўства Патрыс. Іх задача: імітуючы аграбленне, праверыць, наколькі эфектыўна пастаўлена сістэма бяспекі ў кліентаў фірмы. Праца клапатлівая, не абыходзіцца і без прыгод...

Галоўных герояў іграюць Гары Хейм, Сінція Ротрон і Ала Росі.

АДЗІНАЮ ВЕРАЮ МОЦНЫЯ

Не першы год мінскае праваслаўнае брацтва Трох віленскіх пакутнікаў падтрымлівае сувязі з вядомай польскай фірмаю «ОРТАДРУК», якая з'яўляецца ў сваёй краіне пераемніцай слынных кнігавыдавецкіх і друкарскіх традыцый. Заснавальнікі «ОРТАДРУКа» — вядомыя актывісты праваслаўнага руху на Беласточчыне, дзе пражывае беларуская дыяспара.

Днямі ў Мінску адбылася сустрэча прадстаўнікоў польскага праваслаўнага кнігадрукавання з беларускім духавенствам, дзеячамі літаратуры, гісторыкамі, кнігавыдаўцамі. Арганізавана гэтая сустрэча брацтвам Трох віленскіх пакутнікаў і экзархатам Беларускай праваслаўнай царквы. Запрошаныя на сустрэчу азнаёміліся з выданнямі польскіх аднаверцаў, вызначылі планы супрацоўніцтва.

Прадукцыя «ОРТАДРУКа» добра вядома ў нашай рэспубліцы. Гэта беларускія праваслаўныя календары, часопісы. Зараз рыхтуецца сумесны праект новага выдання «Праваслаўная архітэктура Вялікага княства Літоўскага».

Госці з Польшчы наведалі мінскія выдавецтвы, былі прыняты ў міністэрскіх структурах, у Беларускім экзархаце.

На здымках: выданні «ОРТАДРУКа» для беларускіх чытачоў; у час сустрэчы з духавенствам і прадстаўнікамі грамадства; з беларускімі мастакамі і выдаўцамі гутарыць рэктар Мінскай духоўнай семінарыі епіскап Канстанцін.

Яўген ПЯСЕЦКІ.
(Фота аўтара).

ТЭЛЕБАЧАННЕ, 8 лютага

Беларускае тэлебачанне

10.10 «Востраў загінуўшых караблёў». Маст. фільм. 1-я і 2-я серыі.
12.25 Музычны салон Элеаноры Язерскай. «Усё пачынаецца з кахання...»
13.05 «Людзі на балоце. Палеская хроніка». Маст. фільм. 7-я серыя «Дні надзей».
15.00 Навіны.
15.15 «Рукапісы «Пушкіна». Дак. фільм.
15.40 «За сінімі начамі». Маст. фільм. 2-я серыя.
16.50 Тэлебачанне — школе. Беларуская літаратура. 7-ы клас. «Цвяток радзімы васілька». Вершы Максіма Багдановіча.
17.20 «Госці ў хату».
17.50 Музычны антракт.
18.00 Да 75-годдзя народнага пісьменніка Беларусі Івана Мележа. Урачысты вечар. Трансляцыя з Нацыянальнага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы.
18.50 Навіны (з сурдаперакладам).
19.05 Да 75-годдзя народнага пісьменніка Беларусі Івана Мележа. Працяг урачыстага вечара.
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
21.55 Музычны антракт.
22.05 «Цудоўная спрачальніца». Маст. фільм. 2-я серыя.
23.20 «Крок». Праграма для моладзі.
23.50 «Белы матылёк». Мультфільм для дарослых.
24.00 Навіны.

ГРТ

8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 23.10 Навіны.
9.45 «Клуб падарожнікаў» (з сурдаперакладам).
10.30 «Кацяня, якое звалі Гаў». Мультфільм. 2-я гісторыя.
10.40 Смак.
11.10 У эфіры тэлерадыёкампанія «Мір». «Пад дахам свету».
14.20 «У лясным гушчары». Мультфільм.
14.40 Лего-го!
15.10 Цін-Тонік.
15.35 «Элен і хлопцы».
16.00 Рок урок.
16.30 «Сем дзён спорту».
17.20 «Сакрэт Трапіканкі».
18.10 Гадзіна пік.
18.35 Лато-Мільён.
19.00 «Адзін на адзін».
19.45 «Добрай ночы, малышы!»
20.00 Час.
20.30 «Аперацыя».
20.50 Катрын Дэнёў і Амар Шарыф у меладраме «Маерлінг».
23.20 Музагляд-92.
0.00 «Т. С. Н.» («Тэлевізійная служба навін»).
0.50 Хакей. Чэмпіянат МХЛ «Спартак» (Масква) — «Ак Барс» (Казань). 3-ці перыяд.

Канал «Расія»

7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 22.00 Весткі.
10.20 «Санта-Барбара».
11.15 Новая лінія.
14.15 Чэмпіянат свету па біятлоне. 7,5 км. Жанчыны.
16.20 Новая лінія. «Пагаслая зорка?»
16.50 Экспавідэа.
17.05 Юбілейны вечар «Радыё Расіі».
17.55 Кіно з працягам. «Пецярбургскія тайны».
19.25 Падрабязнасці.
19.35 «Санта-Барбара».
20.30 Маскі-шоу.
21.10 Даміно Міхаіла Баярскага.
21.40 Кінаафіша.
22.30 Рака часу.
22.35 Аўтаімгненне.
22.40 Антрэпрыза.
23.25 Экран крымінальных паведамленняў.

НТБ

17.00 «Цудоўныя гады». 74-я серыя (ЗША).
17.30 Паўгадзіны пра тэніс.
18.00, 21.00, 23.00 «Сёння». Інфармацыйная праграма.
18.35 Герой дня.
19.00 Рэгулярныя матчы НХЛ «Нью-Йорк-Дэвілз» — «Пітсбург Пінгвінз».
21.35 Гадзіна серыялу. «Доктар Куін, жанчына-ўрач». 26-я серыя (ЗША).
22.30 Часінка.
23.20 Кіно не для ўсіх. Пітэр Брук. Маст. фільм «Уладар мух» (Вялікабрытанія).

Санкт-Пецярбург

12.00, 15.30, 18.30, 21.45 Інфарм ТБ.
12.10 «Гром у раі». Маст. фільм.
13.00 Хуткая дапамога.
13.30 Парады садаводам.
13.40 «Баль». Тэлеспектакль па матывах твораў А. С. Пушкіна.
14.55 «Экалогія для ўсіх. Вада». Тэлефільм (Германія).
15.10, 16.55, 18.55 Музычны момант.
15.15 Стыль жыцця.
15.40 «Нямецкая хваля».
16.00 Тэлешансон.
16.25 «Іржавыя праўды». Музычны дадатак да «Зебры».
17.00 Па ўсёй Расіі.
17.10 Паказвае Ленінградская АТК.
18.10 Вялікі фестываль.
18.50 Спартыўныя навіны.
19.00 «Гром у раі». Маст. фільм.
19.50 Тэлеслужба бяспекі.
20.00 300-годдзю флоту расійскага прысвячаецца. «Адмірал Крузенштэрн».
20.20 Песні Алега Квашы.
20.55 «Залаты Цялец»? Забаўляльная праграма.
22.00 Спорт, спорт...
22.10 Дзень нараджэння.
22.20 Асабістая справа.

ШАХМАТЫ

Пад рэдакцыяй майстра спорту У. СЫЧОВА

ГАДАВЫ КОНКУРС СКЛАДАННЯ
Заданне № 4

В. Ваўнейка (Мінск)
А. Петрусенка (Гомельская вобл.)

Белыя: Крb8, Лd4, Сb2(3).
Чорныя: Крb3, Фа4(2).
Кааператыўны мат за 3 хады.

ПАСПРАБУЙЦЕ СВАЕ СІЛЫ

Нідэрландскі саюз праблемістаў аб'явіў конкурс складання двуххадовак (суддзя П. ле Гранд), прысвечаны памяці гросмайстра Кора Гольдмедзінга.

Тэма: «Чорная карэкцыя з такім алгарытмам хадоў: 1. Z? а-2. AX, BX.

1. V! a-2. CX, 1...a1! 2. AX. 1... a2! 2. BX».

Прыклад. **Белыя**: Кре7, Лс4, Лg4, Cd3, Kb4, n. d2(6). **Чорныя**: Кре5, Ла3, Лh6, Ke6, nn: a7, h7(6). 2x.

1...K 2.Лс5х, 2. Лg5х. 1. Се4! 2. Кс6х,

1...K 2.d4x, 1...Kd4! 2.Лс5х, 1...Kf4 2.Лg5х.

Творы, адлюстраваныя на дыяграмах, дасылаць да 1 сакавіка 1996 г. на адрас:

Henk Le Grand, Heimanslaan, 5, 6705, AD WAGENINGEN Nederland.

XXIII ТЭМАТЫЧНЫ КОНКУРС

Рэдакцыя газеты «Звязда» разам з рэспубліканскай камісіяй па шахматнай кампазіцыі аб'яўляюць чарговы, XXIII рэспубліканскі тэматычны конкурс складання двуххадовых задач.

Суддзя конкурсу — пераможца XXII тэматычнага конкурсу, кандыдат у майстры спорту Віктар Ваўнейка (Мінск) прапанаваў наступную тэму: «Цыклічнае чаргаванне матаў (не менш трох) у адной фазе на дзве сістэмы гульняў: хады чорнага караля на свабодныя палі і блакіраванне гэтых палёў».

Прыклад: В. Ваўнейка (Мінск) «Schach» 1983 г.

Белыя: Кра4, Фh3, Cb6, Cg2, Ke4, Kg4; nn: a5, c3, d2, d7, e5, f3, f6, g5 (14).

Чорныя: Крd5, Kd8, nn: b7, c5, f7(5). 2x.

Рашэнне. 1. f4! цугцванг.

1...Крс6, Крс4, Кре6 2. K:c5, Kd6, Ke3x.

1... Кс6, с4, Ke6 2. Ke3, Kc5, Kd6x.

У конкурсе могуць прыняць удзел усе жадаючыя аматары шахмат. Пераможцы будуць адзначаны, а аўтар твора, які зойме першае месца, атрымае права судзіць XXIV конкурс складання двуххадовак.

Тэрмін прысылкі задач — да 1 мая бягучага года.

ПАСЯДЗІМ ПА-ХАРОШАМУ

Алег МІНАКОЎ: ПРА ШЧЫРУЮ МУЗЫКУ І ШЧЫРАСЦЬ ПАМІЖ МУЗЫКАНТАМІ

Знаёмцеся: Алег Дагер Мінакоў. Менавіта так сябе называе нядаўна каранаваны лідэр рок-гурта «Рублёвая зона». На Беларусі яго толькі каранавалі, а праславіцца Алег спадзяецца на ўвесь свет. Дзеля гэтага маскоўская фірма «Саюз» выпусціла першы англамоўны кампакт-дыск «Put your money now». Каранацыя выклікала шмат шуму ў рок-тусоўцы Беларусі.

— Калі аналізаваць усё, што адбываецца ў рок-культуры нашай краіны, — пачынае Алег Мінакоў, — я магу сцвярджаць, што на такім узроўні тут ніхто не іграе і ніхто не піша музыку. І не здольны. Дай Бог, каб на наступны год з'явілася нейкая каманда, якая здолела б паказаць клас. Таму што ў нас многія забываюць пра майстэрства музыкантаў, іх узровень. Таму што не ўсё, на жаль, вырашаюць тэксты.

Я займаюся гэтым праектам са студзеня 94-га года. Мы з «Інспектарам», дзе я ўдзельнічаў, якраз вярнуліся з Германіі (нас там вельмі добра адзначылі), і я пачаў дома пісаць песні пад гітару. Музыканты пад мой праект сабраліся вельмі добрыя, усе яны мае сябры — Саша Газіза, Саша Пурус, Саша Візляўскі. Былы барабаншчык «Крамы» Толя Горбач, калі пачуў, што я выконваю свой праект, адразу перайшоў да нас, разумеючы бесперспектыўнасць той каманды. «Крамчукі» ўсе добрыя хлопцы, мне яны падабаюцца як людзі. Але чалавечы фактар — адно, майстэрства — другое. Многія так успрымаюць: калі спяваюць па-беларуску — значыць добра. А калі паглядзець на нейкія там дзяржаўныя амбіцыі, то яны ўжо спрабавалі выходзіць на іншыя краіны, ды нічога не атрымалася.

— А вы так упэўнены, што вашу працу Захад заўважыць, пры тым, што ў іх сваіх гуртоў — паспявай слухаць.

— Я не кажу, што ўпэўнены. Але чаму б не паспрабаваць? У мяне ёсць мэта — атрымаць «Грэмі», але гэта не азначае, што яна здзейсніцца. Бывае, для гэтага варта зрабіць выдатна хоць адну песню, якая б стала самай прадаваемай, пэўны час пратры- [illegible] дзі, а камп'ютэры. Закладваецца праграма, і камп'ютэр выдае, што, напрыклад, у Сцінга за мінулы год было на адзін канцэрт болей, на дзве пласцінкі болей, а ў эфіры пабыў ён болей за іншых можа, на паўгадзіны. І на ўручэнні «Грэмі» да апошняй хвіліны не ведаюць, хто стане першым, распячаткі прыходзяць на момант абвяшчэння намінацыі. Я хачу, каб і ў нас на Беларусі каранцыя адбывалася гэтак жа. І мне вельмі прыемна, што ў сваёй краіне нас не абышлі ўвагай. Каранаванне мяне парадавала, таму што для гэтага не было задзейнічана ніякага капіталу, або [illegible] мацьБеларусь за сур'ёзную дзяржаву, то тыя намінацыі, дзе адзначылі нас, у прынцыпе, асноўныя, за што цэняць музыкантаў у Амерыцы.

Шчыра кажу, я да апошняга моманту не ведаў, што атрымаю, нават не хацеў ехаць на гэтае мерапрыемства. Але Юрый Цыбін сказаў: «Прыязджай, вас чакае сюрпрыз». Мне са сваім характарам было крыху сорамна, не люблю, калі мяне хваляць. Гэтая краіна не безнадзейная, калі тут заўважаюць майстэрства. Я хачу, каб мы лепшае пераймалі з Захаду, каб музыканты добразычліва ставіліся адзін да аднаго. [illegible]

[illegible] рыць свет. Сваёй краіны мала?

— Я разумею, што значыць спяваць па-беларуску — усё адно, што адчарціць сабе мяжу ад Віцебска да Брэста, больш ніхто не будзе слухаць. Многа тут цікавяцца чэшскай музыкай ці ўзбекскай? А калі будзе каманда прафесіянальна спяваць на англійскай мове, яна будзе цікавая ва ўсёй Еўропе. Нашу краіну будуць па ёй пазнаваць і будуць ведаць пра Беларусь з добрага боку.

У рок-н-роле першую ролю адыгрывае не мова. Варта зрабіць добротны музычны матэрыял, прадукт, песню, якая б кранала. Тых жа «Бітлаў» ці «Лед Зепелін» мы слухалі з дзяцінства і без перакладчыкаў. У Германіі шмат каманд, якія спяваюць на нямецкай мове, але мы ведаем толькі «Скорпіёнз». Каб стаць вядомым у свеце, трэба спяваць на міжнароднай мове.

Беларуская мова вельмі прыгожая ў «Палацы». У фолк-калектыве яна гучыць. І хлопцаў чакае вялікая будучыня. У прынцыпе, усе нашы каманды цудоўна ведаюць свой узровень ігры. Яны шчырыя музыканты. Рок-н-рол адрозніваецца ад «папсы» тым, што гэта шчырая музыка. На колькі можаш іграць, на столькі і будзеш. Спадабалася песня — яе купляюць. Не спадабалася — ніякімі грашыма не прасунеш. Глупства, што музыканты зараз плацяць за тое, каб іх паказалі на ТБ, параджэнне пост-савецкага часу, нідзе ў свеце такога няма. А Беларусь увогуле не кранутая шоу-бізнесам зямля. Тут немагчыма зарабіць грошы, будучы музыкантам. Тут не існуе ніякіх прадзюсерскіх кампаній, нават заводаў па выпуску дыскаў. Але мы паспрабуем зарабляць на музыцы. Трэба спяшацца, у маіх музыкантаў ёсць жонкі і дзеткі, якіх трэба карміць.

— Вы ж самі сказалі, што на музыцы не надта заробіш.

— Цяжка, але магчыма. Мае музыканты вельмі доўга працавалі дзеля ідэі, і за гэта я іх і люблю. У мяне [illegible] спрабуем падысці да справы па-іншаму. Ёсць прадзюсерскі цэнтр, які займаецца толькі маім праектам. У нас ёсць кантракт з радыё-РОКС, каб я мог пускаць у эфір нашы песні. Патроху справа павінна пайсці.

Прэзідэнт маскоўскай кампаніі «Паліфон рэкардз», самай цэнтральнай студыі гуказапісу, сказаў, што такой каманды не чуў за апошнія дзесяць гадоў, а ён калісьці працаваў у «Арсенале». Віталь Набережны сказаў, што з часоў «Арсенала» людзі забыліся, што такое іграць. Здаровай, жывой думкі даўно няма і ў Маскве: хто вылазіць за кошт свежага камп'ютэра, хто яшчэ за кошт чагосьці. І ў Маскве бяда з матэрыялам.

— І на колькі ў вас хопіць матэрыялу? Бывае, людзі выдыхаюцца.

— Ужо ёсць песень на два дыскі. Дай Бог, каб працавалася да апошняга дня. Таму што кожны год нясе ў сабе новы зарад, мяняецца мода, гукі. Я яшчэ сябе не знайшоў, шукаю — у стылі, падачы. Люблю Армстранга, Сінатру. У ідэале, хацеў бы іграць такую музыку. І таму ў «Рублёвай зоне» іграе медная група аркестра Фінберга, часам закручваюцца свінгавыя мелодыі. Але пакуль у мяне б'ецца рок-н-рольнае сэрца, я хачу іграць гэта. Я ўвогуле хачу падзякаваць арганізатарам рок-каранацыі за тое, што яны тут, у гэтай краіне, хоць штосьці робяць. І ўсе астатнія нездаволеныя не павінны іх грызці, а павінны дапамагаць. Нікому тут нічога не патрэбна, а ім патрэбна. На[illegible] столькі прыемныя людзі: Юра Цыбін, Віталь [illegible]машка, Адам Палюхов[illegible]. Яны зрабілі справу, а [illegible] каменчыкі кінулі. Пакуль не будзе паміж людзьмі вялікай любові, супрацоўніцтва — не будзе [illegible] нас шчасця.

Гутарыла
Ларыса ЦІМОШЫК.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь, Кабінет Міністраў Рэспублікі Беларусь, калектыў рэдакцыі газеты «Звязда».
Рэгістрацыйны нумар 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.
Рэдакцыйная калегія: У. АНДРЫЕВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), І. БАРАНОЎСКІ, У. ГОЙТАН, В. ЖДАНКО, Л. ЛАХМАНЕНКА, М. МІХАЕВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), А. МЯСНІКОЎ, Л. РЫЖАНКОВА (намеснік галоўнага рэдактара), С. ШАЎЦОЎ.

НАШ АДРАС: 220013, гор. Мінск, вуліца Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда».
ТЭЛЕФОНЫ: [illegible]

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў [illegible]

Друкарня выдавецтва «Беларускі Дом друку». Мінск, пр. Ф. Скарыны, 79. [illegible] Індэкс 63850. [illegible]